НАРОДНЫ КАЛЯНДАР НА 2024 ГОД

8–9

СПАРТЫЎНЫЯ РЭКОРДЫ АЛІНЫ ЗМУШКО

13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

13 СТУДЗЕНЯ 2024 г. СУБОТА № 9 (30143)

Вечар, шчодры на радасць

Сёння — Шчодры вечар, Багатая куцця. Любімае народнае свята, падчас якога калядавалі, весяліліся, частаваліся прысмакамі. Яго і сёння шануюць, адзначаюць. Прычыніцца да спрадвечнай традыцыі калядавання можна не толькі ў вёсцы, але і ў вялікім горадзе. Напрыклад, у дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы для выхаванцаў дзіцячага садка № 150 г. Мінска зладзілі святочную праграму «Калядкі ў Купалавым доме», падчас якой супрацоўнікі музея ў гульнявой форме распавялі дзецям, як беларусы адзначаюць Каляды на працягу стагоддзя. Удзельнікі праграмы павадзілі карагоды з Казой і калядоўшчыкамі, паспявалі песні, патанцавалі, адгадалі загадкі, напісалі і намалявалі добрыя пажаданні, упрыгожылі імі сімвалічную ялінку, эмацыянальна паглядзелі паказ лялечнага тэатра. Кожны прысутны атрымаў сувенір на памяць аб наведванні музея.

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Марына АРЦЁМЕНКА, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны:

«Стацыянарныя формы сацыяльнага абслугоўвання становяцца ўсё больш запатрабаванымі. У першую чаргу гэта абумоўлена старэннем насельніцтва. З узростам людзі маюць патрэбу ў большым аб'ёме догляду, сацыяльным абслугоўванні. Пры гэтым найбольш запатрабаванымі застаюцца сацыяльныя паслугі дома. Чалавеку важна як мага даўжэй заставацца ў хатніх, сямейных умовах. Будзем выбудоўваць сістэму, каб людзі атрымлівалі ўсе неабходныя паслугі дома. Выдатна, што ёсць магчымасці і ўмовы, каб развіваць сістэму сацыяльнага абслугоўвання. Вельмі важна, што яна гнутка рэагуе на запыты насельніцтва».

КАРОТКА

• Жыхарцы аграгарадка Александрыя настаўніцы матэматыкі і класнаму кіраўніку Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі Таццяне Мікалаеўне Карпечанка 12 студзеня споўнілася 100 гадоў. Яна атрымала віншаванні і ад кіраўніка дзяржавы.

• Новую аперацыю з прымяненнем пластыкі e-TER асвоілі ў Гродзенскай універсітэцкай клініцы. Падчас адной аперацыі можна вырашыць дзве праблемы: праапераваць кілу і ўстанавіць імпланты, якія дазволяць мінімізаваць рызыку яе вяртання ў будучыні.

ISSN 1990 — 763X

Спажывец

«СОНЕЙКА» ЗІМЫ

Маніторым цэны на «самыя зімовыя вітаміны»

Беларуская зіма пахне мандарынамі — гэта традыцыя, якой няхай не стагоддзі, аднак, ва ўсякім разе, дзесяцігоддзі. У нас мандарыны, вядома, не растуць, у продажы ў нашы дні круглы год, і ўсё ж іх пах і смак у свядомасці многіх, і нават, не пабаюся гэтага слова, большасці нашых суграмадзян (хочаце — самі спытайце ў сяброў і знаёмых) непарыўна звязаны менавіта з зімой «па-беларуску». З дамашняй цеплынёй і вячэрняй утульнасцю пад акампанемент мокрага снегу за акном.

СТАР. 5

Паедзем, паглядзім!

НА ПАЎНОЧНЫМ ПОЛЮСЕ... БУРЫЯ МЯДЗВЕДЗІ

Чым прываблівае турыстаў «беларускае запаляр'е»

Гарадскі пасёлак Езярышча, што знаходзіцца ў Гарадоцкім раёне Віцебскай вобласці, вядомы ў краіне як «беларускае запаляр'е». Яно і нядзіўна, бо менавіта гэты населены пункт — рэкардсмен па самых нізкіх тэмпературах і самых высокіх снегах. Ці развіваюць мясцовыя ўлады «халодны» брэнд, як жыхары прыручылі стыхію і якія яшчэ турыстычныя разынкі ёсць у Езярышчанскім сельсавеце — адказ на гэтыя і іншыя пытанні карэспандэнт «Звязды» знайшла на месцы, завітаўшы на «беларускі паўночны полюс».

СТАР. 4

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ЯКАСЦЬ ЖЫЦЦЯ — ГЭТА НЕ ТОЛЬКІ ПРА ЭКАНОМІКУ І ВЫТВОРЧАСЦЬ. ГЭТА НАЙПЕРШ ПРА ЧАЛАВЕКА»

У свеце сёння вельмі неспакойна, але трэба зрабіць усё, каб на душы ў беларусаў было светла і ўтульна. Аб гэтым кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка заявіў на прыёме ад імя Прэзідэнта Беларусі на стары Новы год.

«Беларусь пераступіла парог новага года. Мы сустрэлі яго са светлымі і добрымі надзеямі, якія непарыўна звязаны з перажытымі падзеямі года мінулага, — сказаў Прэзідэнт. — Стары Новы год дае нам цудоўны шанц падвесці вынікі і ўзяць у новы год усё найлепшае, што ўдалося зрабіць, і тое, чым усе мы разам ганарыліся, ганарымся і захапляемся. Перш за ўсё неацэнныя таленты, добрасумленную працу прафесіяналаў, якія прысутнічаюць сёння ў гэтай зале, — журналістаў, дзеячаў мастацтва, настаўнікаў, сацыяльных работнікаў».

Сярод запрошаных таксама — тыя, чыя дзейнасць звязана з прыняццем дзяржаўных рашэнняў, удасканаленнем сістэмы аховы здароўя насельніцтва, абаронай міру і стабільнасці ў грамадстве, забеспячэннем непарушнасці граніц і бяспекі краіны, дадаў Аляксандр Лукашэнка.

«Сёння, паважаныя сябры, у свеце вельмі неспакойна, але мы павінны зрабіць усё, каб на душы ў беларусаў было светла і ўтульна, — падкрэсліў беларускі лідар. — Хачу вас папярэдзіць: свет напярэдадні грандыёзных падзей. Мы сёння ў такой складанай сітуацыі, што гэта падобна таму, што мы ідзём па тонкім лёдзе. Неасцярожны крок — і мы можам патануць, перакуліць дзяржаву. Таму гэты год будзе вельмі складаны. Па ўсіх падзеях — вельмі шумны павінен быць. Але мы павінны зрабіць усё, каб ён быў ціхі і спакойны. Факты сведчаць аб тым, што ў свеце неспакойна. Ці тое яшчэ будзе».

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што з ліку ўладных людзей асабліва амерыканцы не хочуць шматпалярнасці. «Яны хочуць руліць ва ўсім свеце, як гэта было пасля распаду Савецкага Саюза. Украіна, Блізкі Усход, сёння ўжо мяжа Індыйскага і Атлантычнага акіянаў, хусіты... Ідуць паказальныя бамбардзіроўкі толькі дзеля таго, што маюць адбыцца выбары ў Амерыцы і трэба паказаць свой «гераізм», «які я круты», — заявіў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка выказаў апасенні, што гэта дуга нестабільнасці можа працягнуцца і на іншыя рэгіёны свету: «Можа ўспыхнуць уся планета. Гэтага дапусціць нельга».

«Наша задача адна — мір і спакой у нашай дзяржаве», — падкрэсліў беларускі лідар. Звяртаючыся да прэм'ер-міністра Рамана Галоўчанкі, кіраўнік дзяржавы сказаў: «Будзе мір — будзе і спакой. Ад вас, ад урада, ды і ад усіх нас гэта шмат у чым залежыць. Тое, што мы павінны зрабіць, і тое, што мы зрабілі, — за ўсім гэтым стаіць асабісты ўклад кожнага з прысутных».

Прэзідэнт нагадаў, што на працягу мінулага 2023 года ў Беларусі ішлі да міру праз стварэнне, умацоўвалі адзінства, дзяржаўныя і каштоўнасныя асновы беларускага грамадства.

Гэты год аб'яўлены ў Беларусі Годам якасці. «Хачу, каб вы разумелі: якасць — гэта не толькі пра эканоміку і вытворчасць. Напэўна, гэта перш за ўсё, гэта важна, але гэта найперш пра чалавека», — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы.

«У чым сутнасць? Калі кожны чалавек, беларус, наш госць, нашы суседзі, сябры разам з намі пражывуць гэты год і запомняць яго як Год якасці — значыць, атрымалася. Таму трэба зрабіць усё, каб якасць пранізвала кожнага чалавека», — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў Беларусі ўмеюць рабіць усё для жыцця людзей, але часам ёсць недахоп якасці: «Мы ўмеем рабіць, умеем жыць, але трэба рабіць гэта якасна».

Асабліва гэта важна на інфармацыйным фронце, дзе журналістам і экспертам даводзіцца працаваць амаль у баявым становішчы, падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. «У нас няма пакуль (хоць мы часта гаворым аб гэтым) інфармацыйнай вайны. Пакуль не. Трэба зрабіць усё, каб яе не было, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Але ёсць вельмі жорсткае проціборства. Яно заўсёды і ўсюды пачынаецца з унутранай блытаніны, і гэта суправаджаецца інфармацыйным супрацьстаянне, а потым і інфармацыйнай вайной. Не хацелася б, каб гэты працэс у такім рэчышчы працягваўся. Трэба яго спыніць».

Звяртаючыся да журналістаў, Прэзідэнт падкрэсліў: «Будзьце вельмі акуратныя і асцярожныя. Запомніце: ідзём па тонкім лёдзе. Слова сёння вельмі важнае, і яно павінна біць у цэль, у пэўным напрамку, але яно павінна быць вельмі акуратным і асцярожным. І перабраць нельга. Слова і факты з'яўляюцца ў нас з вамі галоўнай зброяй у барацьбе за духоўнасць, традыцыйныя каштоўнасці і сапраўдныя сэнсы».

Аляксандр Лукашэнка пажадаў усім, каб 2024 год аказаўся шчодрым на яркія, запамінальныя, добрыя падзеі, ажыццявіў самыя запаветныя мары, стаў шчаслівым часам для новых ідэй і новых здзяйсненняў.

«Я абсалютна перакананы, што мы справімся з усімі праблемамі, задачамі дастойна. Бо для сапраўдных патрыётаў, якія справамі і намерамі ствараюць цяперашняе і будучыню нашай Беларусі, лёс Айчыны, — самае важнае і самае каштоўнае», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка на прыёме ад імя Прэзідэнта на стары Новы год узнагародзіў работнікаў сродкаў масавай інфармацыі і ўстаноў аховы здароўя.

Прэзідэнт уручыў ордэн Францыска Скарыны старшыні Міждзяржаўнай тэлерадыёкампаніі «Мір» Радзіку Батыршыну, які ўдастоены ўзнагароды за значны асабісты ўклад ва ўмацаванне міру, дружалюбных адносін і супрацоўніцтва паміж дзяржавамі, плённую працу па збліжэнні і ўзаемаўзбагачэнні нацыянальных культур, фарміраванні і развіцці адзінай інфармацыйнай прасторы, высокія дасягненні ў дабрачыннай і гуманітарнай дзейнасці.

Спецыяльныя лісты аб аб'яўленні Падзякі Прэзідэнта Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўручыў намесніку загадчыка аддзела спецыяльных праектаў галоўнай дырэкцыі «Агенцтва тэлевізійных навін» Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Сяргею Бараноўскаму і адказнаму выпускаючаму аддзела выпуску галоўнай дырэкцыі АТН НДТРК Глебу Гарбаценку, палітычнаму аглядальніку аддзела палітычных аглядальнікаў дырэкцыі інфармацыйнага вяшчання ЗАТ «Сталічнае тэлебачанне» Вользе Коршун, дырэктару дырэкцыі інфармацыйнага вяшчання ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал» Андрэю Мохару, загадчыцы аддзела вядучых інфармацыйна-аналітычных праграм дырэкцыі інфармацыйнага вяшчання ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал» Кацярыне Тумас-Цішкевіч. Узнагароды яны ўдастоены за значны асабісты ўклад у рэалізацыю дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі, высокі прафесіяналізм, аб'ектыўнае і ўсебаковае асвятленне падзей грамадска-палітычнага і сацыяльна-культурнага жыцця краіны.

У ліку тых, каму Прэзідэнт уручыў спецыяльныя лісты, — галоўны ўрач Гарадской клінічнай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі Вольга Святліцкая, намеснік галоўнага ўрача па хірургіі Рэспубліканскага клінічнага медыцынскага цэнтра Упраўлення спраў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Юрый Слабодзін і ўрач-эпідэміёлаг інфекцыйна-эпідэміялагічнага аддзела гэтага цэнтра Марыя Аляксеева. Падзяка Прэзідэнта ім аб'яўлена за шматгадовую плённую працу, высокі прафесіяналізм, значны асабісты ўклад у ахову здароўя насельніцтва.

Паводле прэс-службы Прэзідэнта.

Кантэкст

КІРУЮЧЫСЯ РЭАЛІЯМІ І МЕРКАВАННЯМІ БЯСПЕКІ

Лейтматывам нарады ў Прэзідэнта, на якой абмяркоўвалася маючая адбыцца амністыя, было слова «справядлівасць». Таксама гучала патрабаванне кіраўніка дзяржавы падыходзіць да кожнай справы індывідуальна. Але пры гэтым, як падкрэсліла па выніках нарады прэс-сакратар Прэзідэнта Наталля ЭЙСМАНТ, грамадская бяспека была ў найпершым і бясспрэчным прыярытэце.

Менавіта кіручыся інтарэсамі бяспекі грамадства і дзяржавы, МУС прапануе не прымяняць амністыю да тэрарыстаў і экстрэмістаў, якія прыцягнуты да крымінальнай адказнасці. І гэта прапанова падтрымана. «Усе разумеюць, што здзейснілі гэтыя людзі, і на сёння праблема захоўваецца. На жаль, тыя збеглыя, якія сёння знаходзяцца за мяжой, спрабуюць уплываць рознымі спосабамі на нашых грамадзян, асабліва на моладзь. Сітуацыю мы кантралюем, вядзём інтэрнэт-разведку. Таму лічым, што да гэтых асоб прымяняць амністыю нельга. У кожнага, хто асуджаны за экстрэмізм ці тэрарызм, была магчымасць звярнуцца да кіраўніка дзяржавы па памілаванне. На сёння раскаяння мы не заўважылі, таму наша адназначная пазіцыя — не прымяняць амністыю да гэтай катэгорыі асуджаных», — адзначыў **міністр унутраных спраў Іван КУБРАКОЎ.**

Нарада выявіла таксама неабходнасць адаптацыі да сучасных рэалій крымінальнага заканадаўства.

У размове з журналістамі **старшыня Вярхоўнага суда Валянцін СУКАЛА** нагадаў, што ў мінулым годзе была прынята канцэпцыя прававой палітыкі Беларусі, у якой ужо адзначаўся некаторы дысбаланс норм крымінальнага заканадаўства. Для ўстаранення такога дысбалансу Вярхоўны суд прааналізаваў некаторыя санкцыі злачынстваў за менш цяжкія і негвалтоўныя злачынствы. «Мы прыходзім да высновы, што гэтыя санкцыі маюць патрэбу ў карэкціроўцы. У першую чаргу з тым, каб у іх увесці альтэрнатыўныя пазбаўленню волі віды пакарання», — сказаў ён.

Пазбаўленне волі сярод 10 відаў крымінальнага пакарання займае 7-е месца па ступені цяжкасці. «Калі ў санкцыях артыкула за менш цяжкія і негвалтоўныя злачынствы няма нічога, акрамя пазбаўлення волі, вядома, судам вельмі складана выконваць такія неабходныя прынцыпы назначэння пакарання, як суразмернасць, індывідуальнасць і справядлівасць. Каб аблегчыць работу судоў, Вярхоўны суд прапанаваў адкарэкціраваць гэтыя санкцыі, прадугледзець у іх абавязковыя альтэрнатыўныя пазбаўленню волі віды пакарання. Гэта сур'ёзна аблегчыць задачу судоў па вызначэнні сапраўды справядлівага пакарання», — растлумачыў Валянцін Сукала. Па яго словах, такі падыход узгаднілі ўсе ўдзельнікі нарады. У найбліжэйшы час будзе створана спецыяльная рабочая група, якая зоймецца гэтым пытаннем.

Пры гэтым Валянцін Сукала падкрэсліў, што неабходнасць паправак абумоўлена і тым, што дзейны Крымінальны кодэкс сур'ёзна не мяняўся на працягу апошніх 24 гадоў. У гэты перыяд заканадаўцы ўзмацнялі адказнасць за нейкі від злачынстваў. І з часам узнік дысбаланс паміж нормамі Крымінальнага кодэкса. Вярхоўны суд бачыць гэты дысбаланс і таму паставіў пытанне аб змяненні гэтых санкцый. Валянцін Сукала расказаў, што праведзены аналіз паказаў: у Крымінальным кодэксе ёсць 35 артыкулаў за менш цяжкія, негвалтоўныя злачынствы, у санкцыях якіх адсутнічаюць альтэрнатыўныя віды пакарання, толькі пазбаўленне волі. На іх будзе звернута першачарговая ўвага пры падрыхтоўцы паправак. «Я не лічу, што ў кожнай з іх трэба ўводзіць альтэрнатыўныя санкцыі, там ёсць і складаныя, грамадска небяспечныя злачынствы», — сказаў ён. На думку старшыні Вярхоўнага суда, альтэрнатыўныя санкцыі могуць быць па 24 саставах злачынстваў з 35. Гэта можа закрануць, напрыклад, артыкул № 171 Крымінальнага кодэкса, які прадугледжвае адказнасць за арганізацыю занятку прастытуцыяй або ўцягванне ў занятак прастытуцыяй. Але толькі ў першай частцы артыкула, калі адсутнічаюць абцяжарвальныя акалічнасці. Як растлумачыў кіраўнік Вярхоўнага суда, за гэтыя злачынствы былі асуджаны 49 чалавек, але да 31 з іх суды былі вымушаны прымяніць адтэрміноўку выканання пакарання. Пры гэтым кіраўнік Вярхоўнага суда падкрэсліў, што будучыя змяненні крымінальнага заканадаўства ў частцы ўвядзення альтэрнатывы пазбаўленню волі не будуць датычыцца цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў.

Валерыя СЦЯЦКО.

Фінансы

Крэдыт «На родныя тавары» становіцца самым папулярным

Толькі за тыдзень па гэтай крэдытнай лініі Беларусбанк ужо выдаў 2,3 мільёна рублёў

Як адзначыла прэс-служба фінансавага інстытута, падтрымліваючы ініцыятыву ўрада нашай краіны па стымуляванні рознічнага гандлю таварамі беларускіх вытворцаў, з 4 студзеня Беларусбанк запусціў новы крэдыт на спажывецкія патрэбы «На родныя тавары». За тыдзень дзеяння ўнікальнага прадукту, які выдаецца з фіксаванай стаўкай 4 % гадавых, на яго афармленне ўжо пададзена больш за 1200 заявак.

Заключыць крэдытныя дагаворы ўжо паспелі больш за 500 чалавек на агульную суму больш за 2,3 мільёна рублёў. За мінулы тыдзень часцей за ўсё ў крэдыт набывалася прадукцыя ААТ «Керамін», СП ААТ «Брэстгазаапарат», ЗАТ «Атлант», карысталася папулярнасцю тэхніка ТАА «Мотавелазавод» і ААТ «МТЗ».

Нагадаем, падаць заяўку на крэдыт можна як дыстанцыйна (у інтэрнэце — у М-банкінгу, на карпаратыўным сайце), так і ва ўстановах банка па ўсёй краіне. Максімальная сума крэдыту сёння складае 12 тысяч рублёў. Разлічыць арыенціровачны плацеж, зыходзячы з патрабаванай сумы або плацежаздольнасці, можна з дапамогай калькулятара крэдытаў (разлічваецца на сайце банка). Так, пры суме крэдыту ў 5000 рублёў плацеж у месяц складзе каля 160 рублёў, з іх па працэнтах — парадку 17 рублёў.

Поўны пералік тавараў і брэндаў, чыю прадукцыю можна набыць з дапамогай крэдыту «На родныя тавары», можна прачытаць у нашай газеце за 9 студзеня ў матэрыяле «Такога льготнага крэдыту спажыўцы яшчэ не бачылі».

Сяргей КУРКАЧ.

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607. УНП 191021390
Продавец	ОАО «БАТЭ» – управляющая компания холдинга «Автокомпоненты», г. Борисов, ул. Даумана, 95. УНП 600017855
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5
Адрес ЭТП	www.ipmtorgi.by

Предмет электронных торгов – оборудование, бывшее в употреблении, по адресу: Минская обл., г. Борисов, ул. Даумана, 95, 107

№ лота	Инв. номер	Наименование оборудования	Модель оборудования	Начальная цена без учета НДС* бел. руб.
1	9100296	**ножницы 1971**	Н-3121	**10 841,63**
2	9060181	**горизонтально-фрезерный станок 1987 г. в.**	6Р81Г	**3 841,63**
3	9060165	**вертикально-фрезерный станок 1985 г. в.**	6Р11	**5 441,63**
4	9100503	**пресс-ножницы комбинированные 1977 г. в.**	Н5222А	**3 641,63**
5	9030430	**бесцентро-шлифовальный станок 1996 г. в.**	SASL 3/1АД	**9 440,24**
6	9030432	**бесцентро-шлифовальный станок 1996 г. в**	SASL 3/1АД	**7 041,63**
7	9030429	**бесцентро-шлифовальный станок 1996 г. в.**	SASL 3/1АД	**7 041,63**
8	8030182	**бесцентровый шлифовальный автомат 1976 г. в.**	SASL-200	**10 541,63**
9	9020041	**координатно-расточной станок 1964 г.в.**	2А-450	**7 441,63**
10	9020371	**координатно-расточной станок 1995 г. в.**	2431SF10	**25 571,70**
11	9030091	**плоскошлифовальный станок 1969 г. в.**	3Г71	**7 441,63**
12	9060145	**спец. фрезерный станок 1970 г. в.**	ГФ-1362Н1	**5 641,63**

*Примечание: цена продажи предмета аукциона указывается в договоре купли-продажи с учетом НДС, либо, по согласованию с продавцом, с нулевой ставкой НДС при экспорте товаров в государства – члены ЕАЭС

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов www.cpo.by и электронной площадке ИПМ-Торги www.ipmtorgi.by. Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

Задаток 10 % от начальной цены лота перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**10 рабочих дней** после проведения аукциона. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить **вознаграждение 2,9 %** от цены продажи лота в течение **3 рабочих дней** после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» 29.11.2023

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Дата и время начала и окончания электронных торгов:
13.02.2024 с 11.00 до 12.00.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **12.02.2024 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные данные	**Тел.: +375 17-310-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06 E-mail: auction@cpo.by**

Свидетельство о государственной регистрации Брестской областной организации Республиканской партии труда и справедливости № 01-069 **считать недействительным в связи с утерей свидетельства.**
УНП 100005489

Утерянное свидетельство о государственной регистрации Исследовательского частного унитарного предприятия «ЧЕЛОВЕК ГОДА-ВЫБОР ГОДА» (УНП/регистрационный номер 190321703) **считать недействительным.**
УНП 193263368

У люстэрку статыстыкі

ЯКАСЦЬ МЕДЫЦЫНСКІХ ПАСЛУГ, РЭГУЛЯРНАСЦЬ МЕДАГЛЯДАЎ...

...якія яшчэ фактары, па меркаванні беларусаў, уплываюць на стан іх здароўя

Інстытут сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў чацвёртым квартале 2023 года вывучыў меркаванне насельніцтва краіны аб сістэме аховы здароўя і аб уласным здароўі. Апытанне было праведзена ва ўсіх абласных цэнтрах Рэспублікі Беларусь, сталіцы, асобных раённых гарадах і сельскіх населеных пунктах. Аб'ём выбарачнай сукупнасці — 901 рэспандэнт (памылка выбаркі +3,3 %). Метад даследавання — тэлефоннае апытанне на аснове камп'ютарызаванай сістэмы CATI ASSO, якая дазваляе адбіраць рэспандэнтаў у любым рэгіёне краіны, пільна кантраляваць ход даследавання і правяраць выніковасць любога званка.

Лад жыцця і псіхаэмацыянальны стан

Па выніках даследавання, большасць беларусаў (80,5 %) сцвярджае, што здароўе залежыць ад абранага чалавекам ладу жыцця. У ролі іншых фактараў, якія ўплываюць на здароўе чалавека, удвая радзей рэспандэнты згадваюць стан навакольнага асяроддзя (45,3 %) і спадчыннасць (44,2 %). Якасць медыцынскіх паслуг для 38,3 % насельніцтва краіны таксама выступае важным аспектам падтрымання стану здароўя.

Клопат аб ім, на думку ўдзельнікаў апытання, праяўляецца, у першую чаргу, у самастойнай арганізацыі рухомага ладу жыцця (48,5 %) і ў адносінах да харчавання (44,9 %). Таксама насельніцтва краіны адзначае важнасць выканання такіх мерапрыемстваў, як рэгулярнае праходжанне медаглядаў (40,8 %), пазбяганне шкодных звычак (40,2 %), прыём прэпаратаў, якія павышаюць імунітэт (39,0 %).

Далей ідуць кантроль псіхаэмацыянальнага стану (32,2 %) і захаванне рэжыму дня (32,0 %). Таксама рэспандэнтамі згадваліся заняткі фізкультурай, спортам, гартаванне (31,8 %). Пры гэтым 6,3 % апытаных прызналіся, што нічога не робяць для клопату аб уласным здароўі.

Размеркаванне адказаў адносна задаволенасці аказаннем медыцынскіх паслуг па месцы жыхарства дэманструе, што большасць беларусаў (67,8 %) задаволены іх якасцю, а не задаволены — 23,1 %.

Мыццё рук і вакцынацыя

Больш беражлівыя і ўважлівыя адносіны да ўласнага здароўя пасля пандэміі COVID-19 адзначаюць дзве траціны беларусаў (65,7 %). Прызналіся, што пандэмія не паўплывала на іх стаўленне да ўласнага здароўя, 31,3 % апытаных.

Аб рацыянальным успрыманні самазахавальных паводзін і захаванні нормаў гігіены сведчыць папулярнасць практыкі рэгулярнага мыцця рук і выкарыстання антысептыку, пра што паведамілі 66,4 % рэспандэнтаў.

Падтрыманне імунітэту фізічнай актыўнасцю, вітамінамі і БАДамі лічаць мэтазгодным 51,1 % насельніцтва. Каля 50 % апытаных рэгулярна праводзяць вільготную ўборку і праветрыванне памяшканняў. Пазбягаць наведвання грамадскіх месцаў з вялікай колькасцю людзей лічаць эфектыўнай мерай 34,4 % рэспандэнтаў.

Акрамя ахоўных і абмежавальных практык, важнай формай супрацьстаяння вірусным захворванням з'яўляецца вакцынацыя, аб праходжанні якой заявілі 30,7 % апытаных. Чвэрць удзельнікаў апытання (25,1 %) адзначылі, што імкнуцца радзей выкарыстоўваць грамадскі транспарт. Практыку нашэння медыцынскіх масак у грамадскіх месцах адзначае кожны пяты беларус (20,3 %). А кожны дзясяты ўдзельнік апытання паведаміў, што ніякіх ахоўных мер не прадпрымае (10,9 %).

Лічбавыя паслугі ў медыцынскай сферы

Па даных даследавання, больш за палову насельніцтва краіны (60,0 %) інфармаваныя аб дзейнасці аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы «Электронны рэцэпт». Астатнія грамадзяне (39,7 %) з ёй не знаёмыя. Не змаглі адказаць 0,3 %.

Пошук лекавых прэпаратаў у аптэках з дапамогай інтэрнэту выкарыстоўваюць 43,2 % насельніцтва. Заказ талона або запіс да ўрача ў анлайн-фармаце прымяняюць на практыцы 35,6 % грамадзян. Да звестак, размешчаных на сайце медустаноў, звяртаюцца 15,6 % беларусаў. Карыстаюцца паслугай выкліку ўрача да дому з дапамогай інтэрнэту 7 % апытаных. Да анлайн-кансультацый урачоў і заказу дастаўкі лекаў у сетцы інтэрнэт звяртаюцца па 2,9 % рэспандэнтаў. Пры гэтым 44,4 % удзельнікаў апытання прызналіся, што не карыстаюцца лічбавымі паслугамі ў галіне аховы здароўя.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

ЗША і Вялікабрытанія нанеслі ўдары па пазіцыях хусітаў у Емене

Узброеныя сілы ЗША і Вялікабрытаніі нанеслі ўдары па аб'ектах еменскага мяцежнага руху «Ансар Алах» (хусіты), паведаміла ТАСС. Паступала інфармацыя аб ударах па пазіцыях хусітаў побач з партовым горадам Хадэйда, размешчаным на захадзе краіны, з боку Чырвонага мора, аб выбухах у гарадах Сана, Саада, Хадэйда, Таіз і Дамар, бамбаванні міжнароднага аэрапорта ў Сане. Прэзідэнт ЗША Джо Байдэн заявіў, што ўдары па аб'ектах у Емене нанесены пры падтрымцы Аўстраліі, Бахрэйна, Канады і Нідэрландаў. Гэтыя дзеянні з'яўляюцца «авантурай нелегальнай кааліцыі», яны ўяўляюць прамую пагрозу глабальнай бяспецы. Аб гэтым заявіла на брыфінгу афіцыйны прадстаўнік МЗС Расіі Марыя Захарава. Масква запытала правядзенне тэрміновага пасяджэння Савета Бяспекі ААН у сувязі з гэтай сітуацыяй. У ЗША пасля ўдараў па аб'ектах хусітаў у Емене пачаліся акцыі пратэстаў. Антываенныя актывісты сабраліся на Таймс-сквер у Нью-Ёрку і каля Белага дома ў Вашынгтоне. Яны патрабавалі кіраўніцтва ЗША «спыніць бамбардзіроўку Емена» і скончыць аперацыю ў сектары Газа. У сваю чаргу прадстаўнік кіраўніцтва хусітаў Абдула бен Амер заявіў, што рух нясе ўдары па базах ЗША і Вялікабрытаніі ў рэгіёне, калі яны пашыраць маштаб баявых дзеянняў. Намеснік кіраўніка МЗС Емена Хусэйн аль-Азі падкрэсліў, што Лондан і Вашынгтон «павінны быць гатовы заплаціць высокую цану» за масіраваныя ўдары па Емене.

Інфляцыя ў Аргенціне перавысіла 210 працэнтаў

Па выніках мінулага года інфляцыя ў Аргенціне перавысіла 210 працэнтаў, а рост цэн склаў 25,5 працэнта. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на інстытут статыстыкі і перапісу краіны. Складальнікі даклада паведамляюць, што ў снежні цэны на транспарт узраслі на больш як 31 працэнт, на медыцынскія паслугі — на 32,6 працэнта, а на прадукты харчавання — на 29,7 працэнта. Таксама адзначаецца, што ў сваім інтэрв'ю радыёстанцыі La Red прэзідэнт краіны Хаўер Мілей паведамляў, што, калі інфляцыя ў Аргентыне ў снежні складзе каля 25 працэнтаў, ён палічыць гэта вялізным поспехам і заслугай новага ўрада. ТАСС паведамляе, што рост цэн у краіне павялічыўся пасля таго, як Мілей быў абраны кіраўніком дзяржавы. Адным з першых хадоў яго ўрада стала павышэнне афіцыйнага курсу долара да 800 песа (раней курс складаў 366 песа за долар).

Элвіс Прэслі вяртаецца на сцэну з дапамогай штучнага інтэлекту

Сёлета ў Лондане і іншых гарадах свету пройдуць шоу Elvis Evolution. На сцэне гледачы ўбачаць галаграму Элвіса Прэслі, паведаміла Euronews. Праз 47 гадоў пасля смерці Прэслі вяртаецца на сцэну. Караля рок-н-рола «ажывяць» з дапамогай штучнага інтэлекту: у лістападзе 2024-га ў Лондане адбудзецца прэм'ера шоу Elvis Evolution — «імерсіўнага канцэртнага вопыту», як яго называюць арганізатары. Гледачы ўбачаць на сцэне поўнапамерную галаграму музыканта, створаную на аснове тысяч хатніх фатаграфій і відэазапісаў. Шоу таксама запланаваны ў Лас-Вегасе, Токіа і Берліне. Ідэя «ажывіць» Элвіса ўзнікла ў арганізатараў пасля поспеху падобнага шоу гурту ABBA, дзе на сцэну праецыраваліся галаграмы ўдзельнікаў гурту ў маладосці — «ABBAтары».

НА ПАЎНОЧНЫМ ПОЛЮСЕ... БУРЫЯ МЯДЗВЕДЗІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Надвор'е ў той студзеньскі дзень спрыяла выдатнаму падарожжу. Калі выязджалі з Віцебска, тэрмометр паказваў доўгачаканы за тыдзень моцных маразоў нуль, а сонейка радавала няхай і не цяплом, але прыемным для зімы святлом. Аднак, як высветлілася на месцы, у Езярышчы зіма гаспадарыла па поўнай.

Сённяшнія магчымасці

Гарадскі пасёлак Езярышча з'яўляецца апошнім беларускім населеным пунктам на еўрапейскім маршруце Е95 перад граніцай з Расіяй. Праз яго праходзіць аўтамагістраль М-8 і чыгунка, што вядзе на Санкт-Пецярбург, таму інфраструктура пасёлка выглядае характэрна: ёсць і новая запраўка, і невялічкая гасцініца «Пралеска» з кафэ. Цяпер тут пражывае крыху больш за 1700 чалавек, а некалі колькасць мясцовага насельніцтва перавышала чатыры тысячы.

Старажылы памятаюць часы, калі тут былі бальніца, радзільны дом, некалькі буйных прадпрыемстваў і школ, але і сёння ў Езярышчы ёсць усе ўмовы для камфортнага жыцця. Бальніцу з шырокім пералікам спецыялістаў замяніла амбулаторыя, школа ў пасёлку засталася адна са 113 вучнямі, працуюць таксама дзіцячы садок, пошта, аптэка, бібліятэка, пост МНС і лясніцтва. Праводзіць вольны час можна ў Доме культуры, а каму трэба больш умоў для заняцця спортам і творчасцю, могуць адправіцца ў райцэнтр Гарадок, да якога паўгадзіны шляху на аўтамабілі. Што радуе вока — у адным пасёлку ажно дзевяць магазінаў без уліку прыездаў шматлікіх аўтакрам, яшчэ і два разы на тыдзень працуе мясцовы рынак. Аўтакрамы абслугоўваюць навакольныя вёскі, у якіх жывуць усяго некалькі чалавек. Так, крама на калёсах рэгулярна прыязджае ў Ляхоўку да адзінага яе жыхара — 85-гадовага дзядулі, які яшчэ трымае гусей.

Мясцовыя цікавінкі

Аматары даўніны летам могуць завітаць на паўвостраў возера Езярышча, дзе знаходзіцца гарадзішча. У XIV стагоддзі тут размяшчаўся двухпавярховы драўляны палац, які адыгрываў ролю ўмацаванага фарпоста на паўночным захадзе Вялікага Княства Літоўскага. Потым на паўвостраве размяшчалася суконная фабрыка. Руін-сведкаў той даўніны не засталося, але сама атмасфера месца з дапамогай фантазіі можа перанесці турыстаў на некалькі стагоддзяў назад. Цяпер востраў з'яўляецца арніталагічным заказнікам, дзе гняздуюцца птушкі, некаторыя з якіх занесены ў Чырвоную кнігу. Цікава іншае: на возеры Езярышча ёсць нямала астравоў, адзін з іх носіць назву Рабінавы. Улічваючы значную глыбіню вады, ад самага берага да вострава пралягае пясчаная сцяжына, па якой можна па пояс дайсці да Рабінавага, а адтуль — на Гарадзішча. Сцяжына гэтая вузкая, няправільны крок — акунешся з галавой, таму выпраўляюцца ў такую разыкоўную вандроўку летам толькі мясцовыя жыхары. А вось зімой, нават калі лёд моцны, на гэтым месцы заўсёды віднеюцца праталіны. Тут жа, на беразе маляўнічага возера, якое з'яўляецца адным з самых вялікіх у Беларусі, мясцовыя ўлады арганізавалі зону адпачынку, дзе летам праводзіцца свята рыбака, турзлёты. Уздоўж берага раскінуўся дэндрапарк, які быў закладзены сельсаветам у 2000 годзе.

Дарэчы, на тэрыторыі Езярышчанскага сельсавета нямала азёр і рэчак. Напрыклад, возера Белае



каля вёскі Сурміно славіцца чысцінёй вады. Старажылы расказваюць, што, калі не было студняў, пітную ваду набіралі адсюль. А вось паблізу ляснога возера Ісцо, глыбіня вады ў якім не больш за паўтара метра, у савецкі час планавалі пабудаваць санаторый-прафілакторый. Справа ў тым, што тут былі знойдзены вялікія залежы сапрапелю, якія выкарыстоўваюцца ў грязелячэнні. Магчыма, калі б тая ідэя была рэалізавана, сёння пад Езярышча на беларускі курорт прыязджалі б з усяго свету. Добра вядома на тэрыторыі вобласці езярышчанская рыба, якая ў рыбакоў і спажыўцоў карыстаецца заслужаным аўтарытэтам.

Ёсць у местачкоўцаў яшчэ адна славутасць — плаціна на рацэ Обаль. З яе, расказваюць людзі, і пачаў засноўвацца пасёлак. З-за перападаў узроўню вады ў жыхароў асушаліся студні, таму плаціна кантралюе сітуацыю і сёння. Не змагла зруйнаваць езярышчанскую славутасць і леташняя вясенняя паводка, хіба толькі прыйшлося падкладваць мяшкі з пяском. А вось моладзь улетку выкарыстоўвае гэты невялікі вадаспад у якасці гідрамасажнай ванны, што рабіць не рэкамендуецца.

Яшчэ ў Езярышчы знаходзіцца помнік у выглядзе савецкага лёгкага танка Т-70. Ён з'яўляецца сапраўднай баявой адзінкай з 16, якія вызвалялі пасёлак у гады Вялікай Айчыннай вайны падчас Гарадоцкай наступальнай аперацыі. Танк быў падбіты пад Езярышчам у 1943 годзе, ён усталяваны на магіле камандзіра 159-й танкавай брыгады Сямёна Паўлавіча Хайдукова. У 2010 годзе танк хацелі перанесці ў Віцебск на Алею Славы, аднак мясцовыя жыхары адстаялі сваю памяць. Аб тым, што на гэту тэму ў «Звяздзе» пісаў і Анатоль Кляшчук, мне расказаў **старшыня Езярышчанскага сельскага Савета Сяргей ЯКУШЭВІЧ.**

Побач з магілай Хайдукова размяшчаецца брацкая магіла, у якой пахаваны каля 300 байцоў. У 2022 годзе напярэдадні Дня Перамогі яна была адкрыта пасля маштабнай рэканструкцыі, сродкі на якую вылучыў абласны Савет дэпутатаў. Усяго на тэрыторыі пасёлка 9 воінскіх мемарыялаў і брацкіх пахаванняў, на тэрыторыі сельсавета — 21. Кожнае з іх дагледжана не толькі школай і арганізацыямі, але і мясцовымі сем'ямі па асабістай ініцыятыве.

Жамчужына Езярышча — метэастанцыя, якая працуе з 1926 года. Толькі надвор'е тут не прагназуюць, а проста перадаюць звесткі ў Белгідрамет. Рэкордаў і сапраўды хапае: у 1940 годзе быў зафіксаваны мароз 41,5 градуса, а 23 верасня 1973 года ў Езярышчы выпаў снег! 10 студзеня 2007 года зафіксавалі тэмпературу 10,4 градуса са знакам «+», а вось роўна праз 17 гадоў, у 2024-м, я асабіста адчула мінус 4 — не рэкорд, але з абласным цэнтрам розніца.

Усім вятрам назло

У Езярышчы я паспрабавала знайсці адказ на пытанне: як у зацяжным халадзе жывуць людзі? Аказалася, так жа, як і на астатняй тэрыторыі нашай краіны. Нельга сказаць, што ў Віцебску ўжо амаль наступае лета, а ў Езярышчы панюць завіруху. Тэмпературная розніца з абласным цэнтрам усяго некалькі градусаў. А вось калі параўноўваць клімат пасёлка з Брэстам, то ў канцы красавіка, калі на Брэстчыне самы разгар палявых работ, у Езярышчы толькі сыходзіць снег. Тут цыкл земляробства пачынаецца на майскія святы, з-за зацяжных халадоў у людзей часта вымярзаюць клубніцы, пладовыя дрэўцы і кветкі, але і з гэтым местачкоўцы навучыліся змагацца. Такіх нізкіх тэмператур, як у 1940-я гады, ужо даўно няма. І выпадкаў, каб людзі насмерць замярзалі, тут не памятаюць. Ёсць, вядома, асобы, якія пад уздзеяннем «зялёнага змея» засыпалі ў гурбах снегу і адмарожвалі канечнасці, але такіх няшмат. У 1990-я гады на возеры фіксавалі здарэнні, калі людзі на снегаходах і аўтамабілях правальваліся пад лёд.

Нягледзячы на тое, што апошнія некалькі гадоў зіма шчодра засыпае паўночны рэгіён, такіх снягоў, як у савецкія часы, усё ж такі нама. Дарослыя ўспамінаюць, што, будучы дзецьмі, можна было на санках і лыжах катацца з дахаў хлявоў. А маці старшыні Езярышчанскага сельсавета Сяргея Якушэвіча ўспамінала, што некалі снег валіў так, што дарога ад Гарадка да граніцы была падобная на снежны тунэль — вышыня покрыва была вышэйшая за аўтобус.

Для мясцовых дзяцей, як і ўсіх астатніх, школьныя заняткі адмяняюцца пры марозе ў 25 градусаў з хуткасцю ветру больш за тры метры за секунду. З пачатку навучальнага года школьнікі толькі адзін раз былі вызвалены ад заняткаў, бо дзеці моцна мёрзлі, пакуль чакалі аўтобус. А з ацяпленнем у сучаснай установе адукацыі, у якой некалькі гадоў таму праводзілі капітальны рамонт, праблем няма — пасяльковая кацельня спраўляецца выдатна.

Насуперак стэрэатыпам людзі ў Езярышчы не злыя ад моцнага холаду, а, наадварот, дружныя. «Мы выраслі ў такім клімаце, таму для вяскоўцаў зіма — гэта звычка. Можа, таму ў нас так шмат доўгажыхароў — холад захоўвае маладосць», — разважае мой суразмоўца Сяргей Якушэвіч.

Соль зямлі езярышчанскай

Людзей, якія з'яўляюцца гонарам гарпасёлка, у Езярышчы не мала. Адна з жывых легенд — Наталля Арсенцьеўна Карэнчукова, якой 104 гады! У пасёлак жанчына трапіла ў 30-я гады мінулага стагоддзя землеўпарадчыкам, нарадзіла дзвюх дачок, і грымнула Вялікая Айчынная вайна. Муж Наталлі пайшоў на фронт, а яна з двума дзецьмі засталася на акупаванай тэрыторыі, хавалася ў лесе, вызжывала і цягнула за сабой малых. Вярнуўшыся дамоў у 1943—1944 гадах, жанчыну сустрэлі толькі голыя сцены. А пасля тыф забраў дзвюх дачок, з фронту прыйшла пахаванка. Як у гэтай мужнай жанчыны хапіла сіл пачаць жыццё спачатку, невядома, але цяпер Наталля Арсенцьеўна поўная сіл і энергіі, умела карыстаецца камп'ютарам і гутарыць з сябрамі і дзецьмі па відэасувязі, абрабляе плантацыі клубніц.

Уладзіміра Аляксеевіча Іванова называюць у гарпасёлку не іначай як геніем або мясцовым Кулібіным. У 82 гады ён стварае самаробныя электрычныя цуды, сярод апошніх — лавушкі для кратоў і гукавое прыстасаванне, каб слухаць пчол зімой. А пчол ва Уладзіміра Аляксеевіча ажно дзевяць домікаў, сам разам з жонкай займаецца вытворчасцю мёду. Але самая незвычайная яго распрацоўка, якую, думаю, уяўляў сабе мала хто, гэта ліфт у драўляным доме! З-за праблем з нагамі з самага дзяцінства мужчына, калі будаваў сваімі рукамі дом, вырашыў зрабіць сабе ліфт на другі паверх. І ўжо 40 гадоў гэта няхітрая канструкцыя, зробленая па самай эканамічнай тэхналогіі гаспадара, бесперапынна працуе.

Уладзімір Аляксеевіч родам з Езярышча, яму давялося жыць і працаваць у Адэскай вобласці, але ўсё ж такі мужчына вырашыў вярнуцца на радзіму. Скончыў будаўнічае вучылішча, пасля атрымаў спецыяльнасць кінамеханіка першага класа. Гарадоцкі Кулібін яшчэ ў 1962 годзе заняў першае месца на беларускай выставе з асабістай распрацоўкай у галіне кінапуску. Пабудаваў сваімі рукамі дом сабе і дачцэ, а пасля пераквалiфікаўся ў электрыкі. 32 гады адпрацаваў у пасёлку на адным месцы. Не толькі заядлы вынаходнік, але і паляўнічы, Уладзімір Аляксеевіч быў адным з першых, хто ў 70-я гады мінулага стагоддзя сабраў радыёстанцыю і стаў прымяняць яе на паляванні.

Касалапае суседства

Мядзведзямі Гарадоцкі раён славіўся яшчэ з савецкіх часоў. Асабліва іх папуляцыя выраслa ў апошнія гады, амаль ва ўсіх раёнах Віцебскай вобласці фіксуюць з'яўленні бурых мядзведзяў. У Езярышчы выпадкаў, калі касалапы нападаў на чалавека, не было, а вось тое, што мясцовыя жыхары і паляўнічыя сустракаюцца з гэтымі жывёламі твар у твар, — з'ява частая і непрыемная. Мой суразмоўца расказаў, як двойчы на адлегласці пятнаццаці метраў бачыўся з мядзведзем і мядзведзіцай. Жыхары аддаленых вёсак, асабліва пажылыя людзі, навучыліся не звяртаць увагі на мядзведжыя сляды пад акном, а вось маладыя сем'і, якія апошнім часам перабіраюцца ў экалагічна чыстыя вёскі, ставяць аўтаматычныя ліхтары і сірэны на выпадак такой сустрэчы. У Расіі мядзведзь баіцца чалавека, паляванне на яго дазволена, таму, мяркуюць людзі, касалапыя бягуць на беларускі бок, дзе паляванне на гэтых жывёл забаронена. Мясцовыя бачаць у гэтым праблему.

Беларуска-расійская міграцыя

Улічваючы, што праз 18 кіламетраў ад Езярышча ўжо Расія, многія з мясцовых жыхароў ездзяць на працу ў Невель. Той бок пусціў нават прамы аўтобус. Але і ў гарпасёлку пакрысе развіваецца малы бізнес: хтосьці прымае ў насельніцтва грыбы, ягады і слімакоў (у будучыні бізнесмен плануе пабудаваць слімаковую ферму), хтосьці выпускае піламатэрыялы, займаюцца рамонтам вялікагрузаў і аказаннем транспартных паслуг. Расіяне актыўна набываюць закінутыя будынкі з мэтай арганізацыі малых прадпрыемстваў, а прадстаўнік Інданезіі набыў у пасёлку будынак былой спецыяльнай школы-інтэрната, каб запусціць там вытворчасць. Атрымаецца або не — час пакажа.

Ахвотна расіяне набываюць у пасёлку дамы пад дачу, летась сельсавет па Указе № 116 прадаў два такія будынкі. Выдатныя дарогі, развітая інфраструктура — чаму і не набыць домік у «беларускім запаляр'і»? Тым больш што нядаўна на чатырох вуліцах замянілі лініі электрапередачы, людзі сталі актыўна ўсталёўваць электракатлы для ацяплення.

***

Падчас экскурсіі па гарадскім пасёлку надвор'е рэзка змяніла свой настрой: мароз у мінус 4 пашчыпваў за рукі, а пасля ўзняўся моцны вецер з завірухай, закідваючы мне ў кішэні белыя, як пенапласт, шарыкі снегу. Паўночны полюс і ёсць паўночны полюс! Пакуль сваю кліматычную адметнасць мясцовыя ўлады не зрабілі раённым брэндам, але, магчыма, калісьці тут будуць ладзіць вялікае свята снегу. Пакуль жа раю зехаць у Езярышча хоць бы летам — прыродныя краявіды тут уражваюць!

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.

г. п. Езярышча.

«СОНЕЙКА» ЗІМЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Зрэшты, можна паглядзець на пытанне шырэй. У халодную пару года на нашых прылаўках самыя даступныя, смачныя і якасныя «жывыя» вітаміны — гэта цытрусавыя: апельсіны, лімоны, грэйпфруты, хоць у першую чаргу, вядома ж, — мандарыны. Не будзе перабольшаннем сцвярджэнне, што на прадуктовых рынках краіны ўзімку заўсёды «аранжавы настрой»: цытрусавых на прылаўках — на любы густ і смак. Дыяпазон цэн таксама шырокі. Высвятляем, што пачым.

МАНДАРЫНЫ І КЛЕМЕНЦІНЫ

Напачатку заўважым, што не ўсе мандарыны — па факце... мандарыны. Парадоксу тут няма. Проста ўсё тое, што мы «да кучы» прывыклі зваць мандарынамі, насамрэч — не заўсёды яны. Гэта могуць быць, напрыклад, клеменціны («плод кахання» мандарына і апельсіна, яны буйнейшыя, скурка «друзлая» і больш тоўстая, чысцяцца лягчэй), або танжэрыны (навукоўцы разглядаюць іх як самастойны від цытрусавых), або сатсума (наогул лічыцца, што гэта сорт мандарынаў, хоць некаторыя спецыялісты адносяць іх, зноў жа, да асобнага віду цытрусавых). Ды і, уласна кажучы, непасрэдна ў мандарынаў ёсць розныя сорты і гібрыды. У свеце, дарэчы, існуе больш за 450 сартаў мандарынаў, але да нашых шырот даязджае з іх не надта шмат. Хоць разнавіднасцяў 6-8 наўскідку, проста па знешнім выглядзе пладоў, на Камароўцы мы налічылі. Гэта пры тым, што далёка не заўсёды прадавец здольны назваць сорт або гібрыд — часцей ідэнтыфікуе свой прадукт па краіне-вытворцы. І тут у параўнанні з мінулым годам — без сюрпрызаў: Грузія, Турцыя, Марока (настальгія па дзяцінстве, прывітанне), Паўднёва-Афрыканская рэспубліка (ПАР), Грэцыя, Іспанія і Італія.

Сярэдняя цана на мандарыны ў гэтым годзе на галоўным харчовым рынку сталіцы — 7- 9 рублёў за кіло (6-8 было ў мінулым годзе). Клеменціны абыдуцца ў сярэднім у 8 з паловай рубля за кілаграм. Самыя дарагія таварныя пазіцыі — 14,90 за «элітныя» італьянскія мандарыны, і 14 рублёў за кіло мандарынаў памеру «бэбі» з Абхазіі. Зрэшты, можна знайсці абхазскія мандарыны і па 4,90 за кілаграм. На слушнае пытанне, у чым прынцыповая розніца з абхазскімі ж, але па 13, на суседнім прылаўку, прадаўшчыца Валянціна ўсміхаецца і паціскае плячыма:

— Я сама працую, у мяне прадаўцоў няма, я маленькія накруткі раблю. Там, можа, працуюць па-іншаму, прадаўцы ў іх, большыя выдаткі. Гэта ж рынак! Кожны пакупнік шукае тое, што яму больш падабаецца! У мяне

таксама ёсць дарагія мандарыны — вось, з Італіі. Якія найлепшыя? А вы каштуйце і купляйце, што спадабаецца.

У цэлым, «прэміум-мандарыны» адрозніваюцца ад больш «народных» варыянтаў для прадаўцоў у першую чаргу тым, што дарагія — усе аднаго памеру, а бюджэтныя — рознакаліберныя: большыя і меншыя трапляюцца ў адным кілаграме. Для пакупнікоў, зразумела, важнейшыя смакавыя якасці.

Аб смаках мандарынаў з розных краін прадаўцы ахвотна расказваюць.

— Мандарыначкі пакаштаваць хочаце? Італьянскія — самыя салодкія, за імі па салодкасці ідуць з Марока, потым Іспанія і Грузія.

Не ўсе мандарыны — па факце... мандарыны. Парадоксу тут няма. Проста ўсё тое, што мы «да кучы» прывыклі зваць мандарынамі, насамрэч — не заўсёды яны. Гэта могуць быць, напрыклад, клеменціны («плод кахання» мандарына і апельсіна, яны буйнейшыя, скурка «друзлая» і больш тоўстая, чысцяцца лягчэй), або танжэрыны (навукоўцы разглядаюць іх як самастойны від цытрусавых), або сатсума (наогул лічыцца, што гэта сорт мандарынаў, хоць некаторыя спецыялісты адносяць іх, зноў жа, да асобнага віду цытрусавых).

У мараканскіх, дарэчы, цяпер іншыя налепкі на скуры — блакітныя. Але на скрынях захаваліся настальгічныя чорныя ромбікі, памятныя ўсім «народжаным у СССР». Па словах сураз-моўцы, найбольшым попытам карыстаюцца ў пакупнікоў якраз мандарыны з Марока, а таксама італьянскія. Гэта — два самыя запатрабаваныя віды. Мандарыны з Абхазіі могуць быць па смаку розныя — трэба каштаваць. Могуць быць з кіслінкай, на аматара.

— Усё ж такі, калі казаць пра мандарыны і апельсіны, нашы пакупнікі ў большасці сваёй ласуны, аддаюць перавагу салодкім відам, — рэзюмуе жанчына за прылаўкам. — Але свой смак знойдзе кожны: у мяне шэсць відаў мандарынаў з розных краін, і ўсе яны розныя. Але ўсе без костачак!

Таксама ў размове я даведалася, што турэцкія мандарыны могуць быць як салодкімі, так і кіслявымі, а часам бываюць вадзяністымі; лепш за ўсё захоўваюцца мандарыны іспанскія, а італьянскія лягчэй за ўсё чысцяцца.

Аб густах не спрачаюцца, так што на чужое меркаванне лепш не абапірацца і каштаваць самім, яшчэ раз раяць прадаўцы. Каштаваць на Камароўцы мандарыны цяпер даюць ахвотна, бо менавіта гэтыя цытрусавыя ўзімку «робяць касу» на фруктовых прылаўках. Выбіраючы мандарыны, зважаем на адсутнасць «пухласці» — паветра паміж мякаццю і скуркай. Калі навобмацак скурка лёгка прамінаецца і «мячык» не пругкі, значыць, мандарыны «пухлыя», тобок нясвежыя. Зразумела, плямкі і ўвагнутасці на скурцы недапушчальныя — гэта падмерзлыя мандарыны, і купляць іх не варта. Калі вы адкрылі мандарын і адна долька аказалася сапсаванай — выкідвайце ўвесь плод: нават нармальныя з выгляду долькі будуць мець непрыемны прысмак (не кажучы ўжо пра шкоду для здароўя).

Што яшчэ дадаць аб мандарынах? Гэта скарбніца вітаміну С, а таксама B_1, B_2, правітаміну А, D, К і B_{12}. Больш за ўсё вітаміну С, дарэчы, у клеменцінах (50 мг аскарбінавай кіслаты на 100 г фрукта). Клеменціны на рынках зараз можна знайсці і па 6,50.

Багатыя і мандарыны, і клеменціны фітанцыдамі (адсюль выяўленае супрацьмікробнае дзеянне), арганічнымі кіслотамі, пекцінавымі рэчывамі, мінеральнымі солямі. Падтрымліваюць імунітэт і аказваюць агульнаўмацавальнае дзеянне, падаўляюць выпрацоўку гармону стрэсу карцізолу і змагаюцца з «зімовай дэпрэсіяй», нармалізуюць страваванне і паляпшаюць абмен рэчываў (але і павялічваюць апетыт). Важна не забываць, што мандарыны валодаюць высокім глікеміческім індэксам, і распаўнець на іх зусім рэальна. Калі вы сочыце за вагой, уключайце іх у ранішні, а не ў вячэрні рацыён.

АПЕЛЬСІНЫ

«Найбліжэйшыя сваякі» мандарынаў — апельсіны — таксама запатрабаваны менавіта зімой, кажуць прадаўцы. У далёкім савецкім дзяцінстве цяперашніх 45-гадовых пакупнікоў апельсіны лічыліся экзотыкай (невыпадкова менавіта ў скрынцы з гэтымі цытрусамі прыбыў морам зневысветленых далячынь у нашы шыроты «генна-мадыфікаваны» звер Чабурашка). У нашы дні апельсінаў на прылаўках вельмі шмат, а прывозяць у Беларусь іх у асноўным з Егіпта, Іспаніі і ПАР.

— Іспанскія апельсіны — вельмі салодкія, для сапраўдных ласуноў. А апельсіны з ПАР — з кісліначкай. Але і тыя, і другія — вельмі сакавітыя, — тлумачыць прадавец.

Роскід цэн на апельсіны не такі вялікі, як на мандарыны, але таксама істотны. У сярэднім цана на кіло егіпецкіх апельсінаў пачынаецца ад 5,50, іспанскія можна знайсці за 6,90. Ёсць апельсіны і па 9,90 — прадаўцы кажуць, ну «проста адзін сок»! Апельсін (а не лімон, у процівагу распаўсюджанаму меркаванню) дыетолагі называюць рэкардсменам сярод цытрусавых па колькасці вітамінаў. Напрыклад, вітаміну С у адным сярэднім плодзе — парадку 77 мг, таксама фрукт утрымлівае ніяцын (вітамін РР), рэтынол (вітамін А), вітаміны B_1, B_2, B_6 і B_9, з мікраэлементаў — магній, фосфар, цынк, жалеза, хлор, кальцый, натрый. Багатыя апельсіны ёдам, пекцінам, фоліевай кіслатой, антыаксідантамі і біяфлаваноідамі — як вынік, валодаюць бактэрыцыдным і супрацьпухлінным дзеяннем, а таксама дабратворна ўплываюць на крывятворэнне. Рэчывы ў складзе апельсінаў змагаюцца з вірусамі і хваробатворнымі мікраарганізмамі, павялічваюць імунітэт, выводзяць шлакі, чысцяць печань. А яшчэ гэты фрукт амаладжвае арганізм. Акрамя таго, апельсіны рэкамендуюць гіпертонікам — рэчывы ў складзе гэтых цытрусавых, аказваецца, не толькі нармалізуюць артэрыяльны ціск, але і зніжаюць верагоднасць з'яўлення атэрасклерозу і разрэджваюць кроў. Вялікая колькасць фоліевай кіслаты ў гэтай садавіне станоўча ўплывае на здольнасць да працягу роду ў мужчын.

ЛІМОНЫ І ЛАЙМЫ

Лімоны ў нашых шыротах у асноўным купляюць у прафілактычных і лячэбных мэтах, расказалі прадаўцы. Найбольш часты пакупніцкі запыт — кілаграм мандарынаў і адзін-два лімончыкі. Але бывае, што бяруць лімоны і кілаграмамі, часцей за ўсё для «народных» вітамінных сумесяў з арэхамі і мёдам або каб проста парэзаць у слоік, засыпаць цукрам або заліць мёдам — лічыцца, што гэта добрая прафілактыка прастуд і грыпу. І небеспадстаўна. Хоць лімон з цукрам лепш не захоўваць, а з'ядаць адразу, і кожны раз рыхтаваць разавую «порцыю», бо вітамін С хутка разбураецца. Плюс вялікая колькасць цукру ў такой сумесі — гэта ўжо, зразумела, не пра карысць для арганізма. Дарэчы, вітаміну С у лімонах значна менш, чым, напрыклад, у чорных парэчках або шыпшыне. І ўсё ж менавіта лімоны застаюцца ў нашых шыротах у ліку рэкардсменаў сярод «зімовай» садавіны па ўтрыманні вітаміну С. Гэтыя цытрусавыя ўтрымліваюць парадку 40 мг аскарбінавай кіслаты на 100 г: менш, чым апельсіны, але ўсё роўна шмат.

Акрамя таго, лімоны валодаюць збалансаваным мінеральным складам: жалеза, медзь, калій і кальцый. Як вынік, ужыванне ў ежу гэтых прадуктаў нармалізуе частату сардэчных скарачэнняў і, як і ў выпадку з апельсінамі, падтрымлівае ў норме артэрыяльны ціск. Акрамя таго, цытрус багаты вітамінамі А (значыць, падтрымае вастрыню зроку), групы В (папярэджвае хваробы нерваў) і вітамінам Р (а ён якраз неабходны для засвоення вітаміну С). Пекцінавыя рэчывы, якія змякчае лімон, выводзяць цяжкія металы, а водар дэзынфіцыруе паветра і павышае настрой.

А яшчэ лімонам у «ліхія дзевяностыя» называлі мільён — рублёў ці долараў. Хоць гэты маўленчы абарот значна старэйшы, чым здаецца, адзначаюць лінгвісты. Упершыню мільён сталі звяць лімонам у 1920—1930 гг., потым сэнсавая падмена забылася больш чым на паўстагоддзя і вярнулася ва ўжытак толькі ў 1990-я. Вынайдзены «тэрмін» у Закаўказскай Сацыялістычнай Федэратыўнай Савецкай Рэспубліцы — яна была пастаўшчыком лімонаў для ўсяго СССР, адсюль і аналогія.

Сёння лімоны наша краіна экспартуе ў асноўным з Іспаніі і Турцыі. У адносінах да цаны на іх гэтай зімой прадаўцы аднадушныя: 7,50-7,90 за кіло. Істотных ваганняў у большы або меншы бок знайсці на галоўным рынку сталіцы не ўдалося.

— Лімоны добрыя, не гібрыды, — кажа прадавец. — Гібрыды не ўсім даспадобы. Тоненькая скурка, і, як кажуць пакупнікі, пахнуць ігліцай. Сорты лімонаў ніякіх дадатковых водараў не маюць. З сярэдзіны студзеня да сярэдзіны лютага гібрыдаў лімонаў вялікую колькасць будуць завозіць. А гэта — лімоны сапраўдныя, сартавыя, новага ўраджаю, іспанскія.

«Прэміум-мандарыны» адрозніваюцца ад больш «народных» варыянтаў для прадаўцоў у першую чаргу тым, што дарагія — усе аднаго памеру, а бюджэтныя — рознакаліберныя: большыя і меншыя трапляюцца ў адным кілаграме. Для пакупнікоў, зразумела, важнейшыя смакавыя якасці.

Выбіраць лімоны рэкамендуецца па вонкавым выглядзе, як і апельсіны — скурка не павінна быць грубай і бугрыстай, плады выбіраем тыповыя па форме і не мяккія навобмацак. Хоць што да скуркі, тут яшчэ ўсё залежыць ад сорту, патлумачылі мне. Напрыклад, у мінулым сакавіку ў магазінах буйнога рытэйлера прадаваліся ружовыя лімоны (скурка ў іх паласатая, жоўта-зялёная, а мякаць — ружаватая). Сорт называецца Eureka Variegated Pink, прыехаў ён з Іспаніі і каштаваў 18,99 за кіло. Тыя, хто каштаваў, сышліся ў меркаванні: па смаку — проста лімон, а пераплачваеш толькі за экзатычную знешнасць.

Лайм — выбар маладых, распавялі прадаўцы. Яго дадаюць не ў звычайны чай «з пакеціка», а ў гарбату «з прэтэнзіяй» — кітайскія і в'етнамскія сарты. А таксама ў кактэйлі і соусы да мяса і рыбы. Словам, гэта выбар тых, хто «затлумляецца» харчаванням. Народнай любові лайм у нашых шыротах не атрымаў: ён не кісла-салодкі, як лімон, а кісла-гаркаваты. Нягледзячы на вонкавае падабенства з «братам», з'яўляецца зусім іншым цытрусавым і мае іншы склад. Напрыклад, у лайме ўтрыманне вітаміну С у пяць разоў большае, чым у лімоне, і ў ім ёсць фоліевая кіслата, якая ў лімоне адсутнічае. Але і каштуе «экзотыка» ў разы больш — у сярэднім 16-16,70 за кіло.

Грэйпфруты і памела залогуваюць асобнай размовы. Пакуль скажам толькі, што цэнавы дыяпазон — ад 10-11 рублёў за грэйпфруты з Ізраіля (з зялёнай скуркай і жоўтай мякаццю) да 5,50-5,70 за турэцкія чырвона-аранжавыя. А памела (фрукт з поўдня Кітая, сваяк апельсінаў, мандарынаў і грэйпфрутаў) каштуе сёлета ў сярэднім 4,5 рубля за кілаграм.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор аукциона)
информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего **государственному предприятию «НИИ Белгипротопгаз»** на праве хозяйственного ведения **(Продавец)**

Аукцион состоится **15.02.2024 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.

Лот № 1:

мини-трактор Беларус-132Н, инв. № 550.

Начальная цена с НДС 20 % – 3 228,00 руб.

Место нахождения: г. Минск, ул. Стебнева, 14.
Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу **gki.gov.by** и на «Электронной торговой площадке **GOSTORG.BY**» Организатора аукциона (gostorg.by).

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор аукциона)
извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Несвижский райагросервис»**

Аукцион состоится **29.01.2024 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Лот № 1:

здание Войниловичского сельского клуба, инв. № 621/С-1026087, 219,1 кв. м.

Адрес: Минская обл., Несвижский р-н, Несвижский с/с, д. Войниловичи, ул. Несвижская, 21.
Земельный участок 624283501101000161, 0,3502 га.
Право постоянного пользования.
Начальная цена с НДС 20 % – 25 120,00 руб.
Задаток – 5 000,00 руб. Шаг аукциона – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатка – **25.01.2024 в 11.00.**

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП»
20 февраля 2024 г. в 14.00 проводит торги по продаже следующих объектов

№ п/п	Наименование объекта продажи	Начальная цена продажи с учетом НДС 20 %, белорусских рублей	Задаток, белорусских рублей
Лот № 1	Капитальное строение с инвентарным номером 700/С-87745, назначение – здание одноквартирного незаселенного жилого дома, расположенное по адресу: Могилевская область, Могилевский район, Княжицкий с/с, д. Браково, ул. Садовая, 2	4 743,07 (четыре тысячи семьсот сорок три рубля 07 копеек) в т. ч. НДС 790,51 (семьсот девяносто рублей 51 копейка)	473,30 (четыреста семьдесят три рубля 30 копеек)

Собственник имущества: закрытое акционерное общество «Агрокомбинат «Заря», 213124, Республика Беларусь, Могилевская область, Могилевский район, Пашковский с/с, аг. Речки, тел. +375222711006, тел. для осмотра объектов продажи +375295459453 – Хрущева Виктория Леонидовна.

Организатор торгов: унитарное предприятие по оказанию услуг «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты», г. Могилев, ул. Циолковского, 1, www.mogilev.cci.by.

Место проведения торгов: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Лот № 1 продается без условий на торгах в форме открытого аукциона с применением метода повышения начальной цены с шагом 5 (пять) процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору торгов в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения торгов; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов (в двух экземплярах); копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком.

Задаток перечисляется на расчетный счет унитарного предприятия «Могилевское отделение БелТПП» № BY88ALFA30122641790010270000 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Могилев, BIC: ALFABY2X, УНП 700016628; физическим лицам – предъявить паспорт; иные документы в соответствии с Положением о порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в собственности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь, организуемых унитарным предприятием «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты».

Условия регистрации, участия в торгах размещены на интернет-сайте продавца по адресу: www.mogilev.cci.by.

Срок заключения договора купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) – в течение 15 календарных дней после проведения торгов.

Срок оплаты за предметы торгов на условиях заключенного договора купли-продажи.

Торги состоятся **20 февраля 2024 г. в 14.00** по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Срок подачи заявления: с момента выхода публикации настоящего извещения в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112.

Последний срок подачи заявления – **19 февраля 2024 г. до 12.00.**

Регистрация участников торгов **20 февраля 2024 г. с 13.30 до 14.00** по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, к. 112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Телефоны для справок: (0222) 778032, + 375447350030 (А1) – Жилина Ольга Александровна. Дополнительная информация размещена на сайте организатора.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА С ПОНИЖЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ НА 55 %

Организатор аукциона: **ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»,** г. Гомель, ул. Гагарина, 20, каб. 2.9.
Продавец: **КПУП «Хойникский ремонтный завод»,** г. Хойники, ул. К. Маркса, 39 – в лице ликвидатора Насонова В.В.

Торги состоятся **23 января 2024 года в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, каб. 2.9.

Подробный перечень имущества в количестве 4 лотов, порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участников торгов, порядок проведения аукциона и условия размещены в газете «Хойніцкія навіны» от 30.12.2023 г.

Срок приема заявлений на участие в торгах и оплаты задатка – **с 15.01.2024 по 22.01.2024 с 9.00 до 16.00.**

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактным тел.: **8 (033) 634-86-95,** Насонов Николай Владимирович (правовая информация, предварительная запись на осмотр имущества); **8 (029) 835-67-42,** Насонов Владимир Валерьевич.

Контактные данные организатора аукциона: **8 (0232) 23-23-54, 8 (044) 599-18-16.**

УНП 400071204

ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

ПОПЛАВСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Березинского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: Минская область, Березинский район, **д. Негоничи, ул. Центральная, д. 45** (полный адрес указан согласно похозяйственным книгам), имеющий основания для признания его пустующим.

Сведения о жилом доме (из акта):
наружные размеры одноквартирного, жилого дома: 6х7 м.
Площадь: 42,0 кв. м.
Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: 1938.
Материал стен: дерево.
Этажность: одноэтажный.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им (ей): Слепица Степан Андреевич (умер 24.03.1991 г., Слепица Анна Петровна (умерла 28.01.1999 г.).

Предположительный срок непроживания в одноквартирном жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 20 лет.

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Поплавский сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такой дом для проживания.

Поплавский сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения уведомить Поплавский сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

Телефоны для справок:
801715-63-818, 801715-63-821, 801715-63-8-25.

УНП 600537220

ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

ПОПЛАВСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Березинского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: Минская область, Березинский район, **д. Негоничи, ул. Приречная, д. 35** (полный адрес указан согласно похозяйственным книгам), имеющий основания для признания его пустующим.

Сведения о жилом доме (из акта):
наружные размеры одноквартирного, жилого дома: 6х9 м.
Площадь: 54,0 кв. м.
Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: 1962.
Материал стен: дерево.
Этажность: одноэтажный.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Сведениями о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им: Трепенок Виктор Климентьевич (умер 20.05.2009 г.), наследник Трепенок Дмитрий Викторович (умер 03.03.2021 г.), наследник Пинчук Светлана Викторовна.

Предположительный срок непроживания в одноквартирном жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 3 лет.

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Поплавский сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такой дом для проживания.

Поплавский сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения уведомить Поплавский сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

Телефоны для справок:
801715-63-818, 801715-6-3821, 801715-6-3825.

УНП 600537220

ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

ПОПЛАВСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Березинского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: **Минская область, Березинский район, д. Гута, ул. Центральная, д. 8** (полный адрес указан согласно похозяйственным книгам), имеющий основания для признания его пустующим.

Сведения о жилом доме (из акта):
Наружные размеры одноквартирного, жилого дома: 5х4,3 м.
Площадь: 21,5 кв. м.
Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: 1958.
Материал стен: дерево.
Этажность: одноэтажный.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Сведениями о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им: собственник **Пшеничникова Наталья Никодимовна**.

Предположительный срок непроживания в одноквартирном жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 25 лет.

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Поплавский сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такой дом для проживания.

Поплавский сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения уведомить Поплавский сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

Телефоны для справок:
801715-63-818, 801715-6-3821, 8 017 15-6-3825.

УНП 600537220

О ПОИСКЕ ПРАВООБЛАДАТЕЛЕЙ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

д. Негоничи Березинского района Минской области

Поплавский сельский исполнительный комитет в целях реализации Указа Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами»

разыскивает собственников, наследников и лиц, имеющих право пользования жилым домом: **Минская область, Березинский район, д. Негоничи, ул. Центральная, д. 45.**

Сельисполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, о месте их фактического проживания либо месте нахождения, сообщить в Поплавский сельисполком по телефонам: 801715-63818,801715-63821 (с 8.00 до 17.00 по рабочим дням), в любое время 8029-7002212.

Также информацию можно прислать по адресу: **223334, аг. Поплавы ул. Октябрьская, д. 2, Минская область.**
Электронный адрес: poplavss@berezino.gov.by

УНП 600537220

О ПОИСКЕ ПРАВООБЛАДАТЕЛЕЙ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

д. Негоничи Березинского района Минской области

Поплавский сельский исполнительный комитет в целях реализации Указа Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами»

разыскивает собственников, наследников и лиц, имеющих право пользования жилым домом: **Минская область, Березинский район, д. Негоничи, ул. Приречная, д. 35.**

Сельисполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, о месте их фактического проживания либо месте нахождения, сообщить в Поплавский сельисполком по телефонам: 801715-63818,801715-63821 (с 8.00 до 17.00 по рабочим дням), в любое время 8029-7002212.

Также информацию можно прислать по адресу: 2**23334, аг. Поплавы, ул. Октябрьская, д. 2, Минская область.**
Электронный адрес: poplavss@berezino.gov.by

УНП 600537220

Брестский филиал
РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Предметы аукциона	Начальная цена, руб. (без учета НДС)	Размер задатка, руб.
Лот № 1: **грузовой самосвал MAZ 555102-4227,** год выпуска 2013 г., регистрационный знак АК 5059-1	14 700,00	1 470,00
Лот № 2: **зерноуборочный комбайн КЗС-1218,** год выпуска 2011 г., регистрационный знак АВ-1 8258	19 600,00	1 960,00

Продавец: ОАО «Агро-сад Рассвет» Брестская обл., Брестский р-н, аг. Вистычи, ул. Центральная, 22, тел./факс 80162 91 91 32. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./ф 8016 240 87 01. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000 в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. Срок заключения договора купли-продажи: в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

Аукцион состоится 13 февраля 2024 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00

Последний день приема заявлений – 12 февраля 2024 г. до 17.00

БАНАНЫ З КАКАІНАМ

Чаму ў Эквадоры разгарэлася грамадзянская вайна?

Сітуацыя ў Эквадоры на слыху ва ўсім свеце. У гэтай лацінаамерыканскай краіне на два месяцы аб'яўлены рэжым надзвычайнага становішча, які быў уведзены прэзідэнтам Даніэлем Набоа. Ён назваў тое, што адбываецца ў Эквадоры, «унутраным узброеным канфліктам». Вайна аб'яўлена 22 злачынным кланам (яны налічваюць дзясяткі тысяч чалавек), у гарады ўвялі войскі. Узровень супрацьстаяння проста беспрэцэдэнтны. На вуліцах узрываюць і падпальваюць машыны, баевікі ўзброены да зубоў — ад пісталетаў да гранатамётаў. Жыццё ў гарадах спынілася. Зняволеныя бунтуюць цэлымі турмамі, звязаных наглядчыкаў саджаюць у калідорах і расстрэльваюць. Чаму ў Эквадоры разгарэлася крывавая грамадзянская вайна, чаго чакаць надалей?

УЦЁКІ ВЕРХАВОДАЎ

Усяго за некалькі гадоў Эквадор ператварыўся са спакойнай краіны ў дзяржаву з самым вялікім рэйтынгам злачыннасці ў лацінаамерыканскім рэгіёне, абышоўшы нават Мексіку і Калумбію. У параўнанні з 2019 годам індэкс забойстваў у 2023-м узрос у пяць разоў, дасягнуўшы адзнакі ў 40 смерцяў на 100 тысяч чалавек.

У пачатку гэтага тыдня 36-гадовы прэзідэнт Эквадора Даніэль Набоа, які ў канцы 2023-га заняў пасаду кіраўніка дзяржавы, апроч рэжыму надзвычайнага становішча, быў вымушаны ўвесці амністыю за перавышэнне службовых паўнамоцтваў для супрацоўнікаў сілавых структур і вайскоўцаў, каб прадухіліць беспарадкі, якія разгарэліся ў краіне. 7 студзеня эквадорская прэса праінфармавала аб уцёках з турмы строгага рэжыму лідара адной з крымінальных груповак краіны «Лос Чонерас» Хасэ Адольфа Масіяса па мянушцы Фіта. У турму строгага рэжыму ў Гуаякіле (уваходзіць у лік самых небяспечных гарадоў свету) Фіта перавялі летась у жніўні з іншай турмы, размешчанай у тым жа горадзе. Яго абвінавачваюць у адпраўцы лістоў з пагрозамі кандыдату ў прэзідэнты Фернанда Вільявісенсіа, застрэленаму за паўтара тыдня да выбараў у жніўні 2023 года.

9 студзеня стала таксама вядома аб уцёках верхавода групоўкі «Лос Лобас» Фабрыцыа Калон Піка па мянушцы Капітан, які абвінавачваецца ў падрыхтоўцы забойства генеральнага пракурора Эквадора Дыяны Салазар. На наступны дзень пасля абвяшчэння дазволу на перавышэнне службовых паўнамоцтваў у Сетцы пачалі з'яўляцца паведамленні аб сур'ёзных беспарадках як мінімум у шасці турмах Эквадора. Паступала інфармацыя аб тым, што злачынцы ўзялі служачых турмаў у заложнікі. Паведамлялася і пра іншыя выпадкі ўцёкаў зняволеных. У інтэрнэце распаўсюдзіліся відэа, на якіх зняволеныя, якія хаваюць свой знешні выгляд, ставяць на калені супрацоўнікаў турмаў, пагражаюць ім расправай і патрабуюць адмены гэтага распараджэння. «Глядзі сюды, Даніэль Набоа! Бо ты ўвёў рэжым, пры якім вайскоўцы змогуць забіваць зняволеных, калі ты пакажашся ў адной з турмаў, ты ўбачыш іх усіх мёртвымі. Мы не просім пяцізоркавыя турмы і нават не просім інтэрнэт. Мы просім права на жыццё», — гаворыць у адным з відэа чалавек з закрытым тварам. Па словах мужчыны ў кадры, відэа знята ў турме Ла Рока, у якой утрымліваўся Фіта. На фоне, хутчэй за ўсё, знаходзяцца супрацоўнікі турмы, да іх галоў і шый накіравана зброя. Яшчэ на адным з відэа, якія распаўсюдзіліся ў сацсетках, бандыт, трымаючы пісталет каля галавы ахоўніка, кажа, што цяпер вайскоўцы і паліцыя — «трафеі». «Вы абвясцілі вайну — вы атрымаеце вайну», — пагражае ён.

САМЫ ЦЁМНЫ ДЗЕНЬ

У той жа дзень злачынцы ўварваліся ў студыю мясцовага тэлеканала TC Television у Гуаякіле. Момант нападзення трансліраваўся ў прамым эфіры. На ім відаць, што людзі, якія хаваюць пад капюшонамі свае твары, пагражаюць зброяй журналістам, у іх у руках таксама знаходзіліся выбуховыя прыстасаванні. На кадрах таксама бачныя людзі, якія закрываюць свой твар рукамі і сядзяць на падлозе, чутныя гукі, падобныя на стрэлы.

Паведамляецца, што ўсе супрацоўнікі тэлеканала былі вызвалены, а злачынцы затрыманы. «Мы вывелі ўсіх супрацоўнікаў тэлеканала, а потым унутр увайшлі тактычныя падраздзяленні. Былі арыштаваны 13 чалавек. Мы не дапусцім беспарадкаў у горадзе», — сказаў шэф эквадорскай паліцыі Сезар Сапата. Тым не менш, як гавораць мясцовыя жыхары, трансляцыя канала перарвалася пасля абеду і так і не аднавілася да раніцы 10 студзеня. На экране стаяла застаўка «Мы хутка вернемся». «Мы жывыя, хоць атака была беспрэцэдэнтна жорсткай. Яны сілай праніклі ў студыю, таму што хацелі, каб мы сказалі тое, што ім было патрэбна», — паведаміў вядучы. Аліна Манрыке, кіраўнік аддзела навін TC Television, расказала агенцтву Associated Press па тэлефоне: «Я ў шоку. Адзінае, што я ведаю: час пакінуць гэтую краіну і з'ехаць вельмі далёка».

Яшчэ адной мэтай злачынцаў стаў нацыянальны ўніверсітэт. Спалоханыя студэнты выбягалі з будынка, а тыя, хто не змог выбрацца на вуліцу, забарыкадзіраваліся ў кабінетах. Увесь горад спыніўся 9 студзеня ўвечары, распавяла iz.ru жыхарка сталіцы Кіта Габі. «Гэта быў цёмны дзень для нашай краіны. Пасля абеду ўсе сталі спешна вяртацца дадому — работадаўцы адпускалі сваіх супрацоўнікаў, а настаўнікі — сваіх вучняў, крамы пачалі рэзка зачыняцца. З акна было відаць, як усе людзі некуды беглі. На дарогах былі жудасныя заторы», — узгадала Габі.

За эфірам тэлеканала ў Гуаякіле са страхам сачыла ўся краіна. Пасля спынення трансляцыі людзі пачалі скардзіцца на перабоі ў руху грамадскага транспарту. Мясцовыя жыхары расказваюць таксама, што сталі сведкамі спроб абрабаваць крамы або падпаліць машыны.

Ужо а палове сёмай вечара 9 студзеня Кіта быў падобны да горада-прывід, каментуе Габі. На вуліцах не было нікога, грамадскі транспарт спыніў сваю работу, крамы былі зачынены. Па сацсетках распаўсюджваліся відэа руху танкаў па вуліцах горада. На наступны дзень большасць людзей працавалі аддалена, тым не менш крамы і грамадскі транспарт аднавілі сваю работу 10 студзеня, хоць строгі кантроль за ўсімі ўваходнымі працягнуўся.

ЗЛАЧЫННЫ «ХАБ»

Пасля здарэння ўрад Эквадора паставіў мэту скончыць з 22 крымінальнымі арганізацыямі, якія арудуюць у краіне, прычым, як паведамляе лацінаамерыканская прэса, як мінімум 14 з іх маюць сувязі з мексіканскімі наркакартэлямі. «Скончыўся час, калі асуджаныя за наркатрафік, наёмнае забойства і арганізаваную злачыннасць паказвалі ўраду, што рабіць. Тое, што цяпер адбываецца ў турмах нашай краіны, — вынік нашага рашэння супрацьстаяць ім», — заявіў прэзідэнт Даніэль Набоа ў відэа, якое распаўсюджвалася эквадорскай прэсай. На ім ён у скураной куртцы (вобраз нагадвае той, што выкарыстоўвае прэзідэнт Сальвадора Наіб Букеле, які вядомы сваёй паспяховай кампаніяй па барацьбе са злачыннымі бандамі) тлумачыць грамадзянам свае далейшыя дзеянні па абароне краіны.

«Гэта высвятленне адносін паміж злачыннасцю і ўладамі. Злачыннасць спрабуе захаваць свае магчымасці быць адным з цэнтраў сілы дзяржавы», — адзначыў iz.ru прафесар факультэта міжнародных адносін СПбДУ Віктар Хейфец. Запыт на бяспеку быў асноўным падчас апошняй прэзідэнцкай кампаніі напрыканцы мінулага года. Галоўнымі прычынамі нестабільнага становішча ў краіне эксперты з ААН называюць высокі ўзровень разрыву паміж дахадамі розных слаёў насельніцтва, бесклапотнасць сярод моладзі, а таксама прысутнасць банд і пашырэнне наркатрафіка.

«Узровень злачыннасці вышэйшы ў найбяднейшых краінах. Да таго ж у індзейскіх народаў, да якіх адносіцца Эквадор, прысутнічае традыцыя вырошчвання кокі. Гэта спрыяла развіццю наркакартэляў і наркагандлю», — кажа саветнік дырэктара Інстытута Лацінскай Амерыкі РАН Мікалай Калашнікаў. Эквадор — адзін з лідараў у Лацінскай Амерыцы па вытворчасці какаіну. Яго важнасць як злачыннага «хаба» па транспарціроўцы наркотыкаў у іншыя краіны ўзрасла з моманту заключэння мірнай дамовы паміж калумбійскімі ўладамі і групоўкай FARC у 2016 годзе (пагадненне аб спыненні агню і спыненні пераследу паўстанцаў у абмен на спыненне дзейнняў па наркатрафіку).

У пачатку гэтага года Даніэль Набоа прапанаваў правесці рэферэндум наконт новых больш строгіх мер бяспекі ў Эквадоры. Прэзідэнт мяркуе павялічыць тэрмін за цяжкія правапарушэнні — абарот зброі і забойствы, а таксама выкарыстоўваць сілы арміі для барацьбы з крымінальнымі групоўкамі ў краіне. Акрамя таго, сярод яго прапаноў было стварэнне плывучых турмаў (караблёў, прыстасаваных для ўтрымання злачынцаў) для змяншэння кантактаў сярод зняволеных. «Эквадорскія турмы даўно ўяўляюць сабой прахадны двор. Заходзь хто хочаш — вынось што хочаш. Дзеючы прэзідэнт прапанаваў узмацніць гэту сістэму. Напэўна, эквадорская злачыннасць вырашыла пайсці на апярэджанне», — лічыць Віктар Хейфец.

КРЫВАВАЯ БАРАЦЬБА

Па меркаванні палітолага, члена праўлення Расійскай асацыяцыі палітычнай навукі Уладзіміра Шапавалава, гэты канфлікт з'яўляецца праявай слабасці дзяржавы. «Такая сітуацыя характэрна не толькі для Эквадора. Яна характэрна для цэлага шэрагу іншых краін свету, краін Лацінскай Амерыкі, у якіх, на жаль, неэфектыўна функцыянуе дзяржаўная ўлада», — лічыць ён. «Даходы Эквадора выводзяцца за мяжу, усё гэта нарошчвае сацыяльнае напружанне ў грамадстве, прыводзіць да яго збяднення, што выліваецца ў масавыя пратэсты. Гэта сітуацыя ўзмацняе ўладу груповак, картэляў, банд. Улада займалася дзялёжкай вялікага пірага, вывадам капіталу ў ЗША. Усё гэта прывяло да таго, што Эквадор пачаў кіравацца бандамі. Даніэль Набоа вырашыў сітуацыю памяняць. Ён вырашыў зрабіць так, каб менавіта прэзідэнт вызначаў палітыку Эквадора, ён пачаў барацьбу са злачыннасцю, гэта пачалося яшчэ восенню», — расказаў RT гендырэктар Лацінаамерыканскага культурнага цэнтра імя Уга Чавеса Ягор Лідоўскі.

Паводле яго слоў, можа быць дастаткова пары дзён ці пары месяцаў, каб проста адвесці банды ў падполле, стварыць сітуацыю знешняй стабільнасці. «Гэта значыць, такія паўмеры. Калі Набоа сур'ёзна вырашыць выкараніць уладу наркакартэляў у Эквадоры, стварыць выразна кіраваную на вертыкалі дзяржаву, тады, магчыма, гэта вайна з арганізаванымі злачыннымі групоўкамі расцягнецца на некалькі гадоў і будзе дастаткова цяжкай, таму што яны назапасілі дастаткова вялікую колькасць узбраенняў і сіл за гэтыя сем гадоў. Але гэта адзіны шлях, як гэта можна выкараніць, паралельна паляпшаючы эканоміку. Па якім шляху пойдзе Набоа сказаць цяжка, але, мяркуючы па яго рыторыцы, ён гатовы ісці да канца ў барацьбе з крымінальнымі элементамі», — заключыў аналітык.

Прадказаць працягласць супрацьстаяння злачыннасці з афіцыйнымі ўладамі складана, адзначаюць эксперты. Тым не менш аказаць моцны ўплыў на сітуацыю ў лацінаамерыканскім рэгіёне эквадорскія беспарадкі не змогуць, лічыць Мікалай Калашнікаў. «Прыклад Калумбіі сведчыць, што барацьба, калі ў яе ўцягнутыя найбяднейшыя пласты насельніцтва, — цяжкая, доўгая, і дамагчыся ваеннай перамогі пакуль што ў Лацінскай Амерыцы нікому не ўдавалася», — заўважыў эксперт. Тым самым ён настойвае на тым, што вырашэнне канфлікту будзе залежаць ад сіл і падрыхтоўкі эквадорскай арміі, а таксама ад таго, наколькі хутка злачынныя групоўкі пагодзяцца здацца, разумеючы, што ўрад не пойдзе на саступкі.

Захар БУРАК.

❍ У тэму

АДНАЎЛЕННЕ ПАРАДКУ

Беларускі бок выказаў цвёрдую падтрымку ўраду Эквадора ў аднаўленні канстытуцыйнага парадку ў краіне. Аб гэтым заявіў журналістам **прэс-сакратар беларускага знешнепалітычнага ведамства Анатоль ГЛАЗ**. «Беларусь выступае за прынцыпы няўхільнага захавання законнасці і правапарадку. Лічым, што іх парушэнне заўсёды прыводзіць да згубных наступстваў, разбурэнняў і трагедый. Гэта паслядоўная пазіцыя нашай краіны. У сувязі з гэтым выказваем цвёрдую падтрымку ўраду Рэспублікі Эквадор у аднаўленні канстытуцыйнага парадку ў сваёй краіне і падтрымліваем легальныя намаганні дзяржаўнай улады, накіраваныя на больш хуткае пераадоленне існуючай крытычнай сітуацыі і аднаўленне міру і спакою як на эквадорскіх вуліцах, так і ў эквадорскім грамадстве ў цэлым», — падкрэсліў Анатоль Глаз.

Міністэрства замежных спраў рэкамендавала беларусам устрымацца ад наведвання Эквадора ў сувязі з пагаршэннем крымінагеннай абстаноўкі. У МЗС звярнулі ўвагу грамадзян, якія знаходзяцца цяпер у гэтай краіне, на неабходнасць няўхільна прытрымлівацца рэкамендацый мясцовых улад. Найбліжэйшая беларуская дыпмісія знаходзіцца ў Калумбіі.

БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ КАЛЯНДАР НА 2024 ГОД

Народны каляндар — гэта сістэма памятных дзён-хранонімаў (свят, ігрышчаў, абрадавых звычаяў, прысвяткаў, працоўных дзён), якія адлюстроўваюць прыродна-храналагічныя веды беларусаў і зафіксаваны ў вуснай традыцыйнай творчасці. Асобныя старадаўнія прыкметы надвор'я, якія звязаны з пэўнымі датамі календара, цяпер ужо страцілі сваю актуальнасць, святкаванні і даўняя абраднасць засталіся толькі ў гістарычнай памяці, а іншыя — у актыўным сучасным бытаванні.

Сістэматызаваны беларускі народны каляндар у складзе з велікодна-валачобнымі песнямі, якія ў строгай храналагічнай паслядоўнасці апісваюць традыцыйныя прысвяткі і святы, у тым ліку тыя, што закансерваваліся ў непараўнальных паэтычных узорах як Навагоддзі / Навалецці, з'яўляецца нашым шэдэўрам і фенаменальнай з'явай сусветнай нематэрыяльнай культуры. Акрамя таго, валачобныя песні, што выконваліся на Вялікдзень, тагачасны Новы год / лета, уяўляюць сабой паэтычны каляндар, падобнага якому няма сярод традыцый народаў зямлі.

У народным календары на 2024 год прадстаўлены асноўныя святы і прысвяткі з кароткімі тлумачэннямі, прыкметамі, прымаўкамі, урыўкамі з валачобных песень і г. д. Дні, якія адзначаюць беларусы-католікі, выдзелены курсівам. Зорачкай /*/ пазначаны святы «рухомай» царкоўнай пасхаліі, што не маюць сталага месца ў годзе.

У наступным, 2025-м, годзе па каталіцкай і праваслаўнай пасхаліі Вялікдзень (Пасха) прыпадае на адзін дзень — 20 красавіка.

Умоўныя абазначэнні: п — панядзелак, а — аўторак, с — серада, ч — чацвер, пт — пятніца, сб — субота, н — нядзеля.

Больш падрабязна пра значэнне хранонімаў календара можна прачытаць у кнігах Алеся Лозкі «Беларускі народны каляндар» (Мінск, 1993, 2002) і інш.

Фота БЕЛТА

СТУДЗЕНЬ

1. п. Новы год. ВКЛ перайшло на студзеньскі стыль у 1550 г., Расія — у 1700 г.

6. сб. Першая, Посная куцця. Перадкалядная вячэра. Які дзень, такі і год. ***Богаз'яўленне, Тры Каралі.*** Католікі праводзілі маскіраваны абрад «Тры каралі», або «Гэроды».

7. н. Раство Хрыстова. Пачатак **Каляд.** «Ой, Калядачкі, бліны-ладачкі...» Калядавалі. Насілі «звязду». Паказвалі батлейку, праводзілі ігрышчы («вадзілі казу», «жанілі Цярэшку», «пяклі ката», гулялі ў «Яшчура» і іншае). ***Хрост.***

9. а. Сцяпан. Даўней дзень найму слуг, батракоў на год. «На святога Сцяпана вышэй слуга за пана».

13. сб. Шчодрая куцця. Пачатак **Шчодрага тыдня.** «Мароз, хадзі куццю есці».

14. н. Васілле. Новы год па праваслаўным календары. «Сею, сею пасяваю, з Новым годам вас вітаю».

18. ч. Трэцяя, Галодная, Вадапосная куцця. Апошнія дні Каляд. «Каляда ад'язджае».

19. пт. Вадохрышча (Кшчэнне). «Святое Кшчэнне ваду ксціла..., свет ачысціла і ваду наверх пусціла», «На Вадохрышча завіруха — на Вялікдзень таксама».

20. сб. Прывадохрышча — заканчэнне Каляд. Пачатак **Малой вясельніцы** (да посту).

24. с. *Аксіння.* «Аксіння дарогу перамяце, а корм падмяце». **Фядос.** «На Фядоса цёпла».

25. ч. *Павел.* «Вее вецер — будзе вайна». **Таццяна.** Свята студэнтаў.

31. с. Апанас, Гусінае свята. Свята свойскай жывёлы. «Хавай нос у апанасаўскі мароз».

ЛЮТЫ

1. ч. *Ігнат.* «На Святога Ігната зіма багата».

2. пт. *Грамніцы, Стрэчанне.* «Калі на Грамніцы нап'ецца певень вадзіцы, то на Юр'я наесца вол травіцы», «Грамніца — хлебу палавіца».

5. п. *Агата.* Каровіна свята. «Хлеб і соль святой Агаты не пусціць бяды да хаты».

6. а. *Дарота.* «Па Дароце высахнуць хусты на плоце». **Паўзіміца Аксіння.** «На Аксінні мяце», «Які дзень на Аксінню, такая будзе і вясна»

11. н. Ігнат. «Ігнат Грамніцам рад».

12. п. Стрэчаньскія Дзяды.

14. с. **Серада Папяльцовая* (пач. Вялікага посту ў католікаў, да 30.03). ***Валянцін.*** Свята закаханых. **Трыфан.** «На Трыфана зорна — вясна позняя».

15. ч. Грамніцы, Стрэчанне. «Зіма з летам сустракалася, пра здароўейка пыталася», «На Грамніцы палавіна зіміцы».

18. н. Агата. Каровіна свята.

24. сб. *Мацей.* «На Мацея дарога пацее», «На Мацея адліга — будзе мароз». **Улассе, Аўлас.** Свята жывёлы. «Аўлас на сыры лас», «Ты, Улас, Улас. Ты наймся ў нас скату пасцівіць».

26. п. Пачатак *Памінальнага, Дзедавага тыдня. Памінальніца. Фаціння. Заступніца ад хвароб (ліхаманкі, трасцы і інш.).

САКАВІК

2. сб. *Памінальніца. Канец Памінальнага тыдня. Калі «вея» ў нядзелю, то авёс трэба сеяць на 9-м тыдні, калі ў панядзелак — то на 8-м, калі ў сераду ці чацвер — то пакідалі «дзесяцінкі дзве».

4. п. *Казімір.* «Святы Казімір дровы сякець і ў клад кладзець».

8. пт. *Дзедава пятніца. Янка, Паўраценне. Мядзведзь паварочваецца ў бярлозе на другі бок.

9. сб. *Масленыя Дзяды (Бабы). «Дзяды не зналі бяды, а нашы ўнукі зазналі мукі».

11. п. *Рабы тыдзень, Вясельніца, Развітальны, Сырапусны, Масленічны тыдзень. Тыдзень перад Масленіцай. Які добры дзень на Масленым тыдні, у той дзень ад Іллі сеялі лён. Дзяўчаты вешалі «калодкі» не жанатым хлопцам. ***Дзень сустрэчы** на Масленым тыдні.

12. а. Васіль Капальнік. Са стрэх капае. ***Рыгор.*** «На святога Рыгора ідуць рэкі ў мора».

13. с. *Лысая серада. На ўзгорках з'яўляюцца «праталіны-залысіны».

14. ч. *Блакітны чацвер. Тумановы дзень. ***Крывы, Тлусты чацвер, Валосы, Валосся.** Свята жывёлы. «На Валосага бліны пяклі ці аладкі, каб былі валы гладкі». **Аўдоцця Вясноўка, Аўдокі. Гуканне вясны.** «На Аўдокі голы бокі». (1.03 Новы год / Новае лета ў мінулым, сакавіцкі каляндарны стыль). «Святы Еўдакей ... пераступ года», «Калі на Аўдакеі добрае надвор'е, то будзе добры лён».

15. пт. *Цешчыны вечары. Хвядот. «На Хвядота занос — усё сена знясе».

16. сб. *Залвіцыны вячоркі.

17. н. *Масленіца. «Масленіца ў «вятху» (пасля поўні) — дзяржы пшаніцу ў мяху, сей пшаніцу на ўсю руку». ***Развітальны, або Дараваны дзень. *Гуканне вясны.** «Блаславі, Божа, зіму замыкаці, вясну загукаці». На Палессі вадзілі карагоды, «спявалі чырачку», насілі ёлку з вянком. **Герасім Гракоўнік.** «Герасім гракоў прыгнаў».

18. п. *Паласказуб. Першы дзень **Вялікага посту** (да 4.05). Паласкалі зубы гарэлкаю (у час посту больш не пілі).

19. а. *Язэп.* «Святы Язэп сярод посту шлюб дае прахвосту» (забарона на шлюб). «На Язэпа пагода — год ураджайны».

20. с. *Уступная серада. Каб урадзіў лён, мылі верацёны ці калаўроты, хадзілі ў карчму і перасказвалі цераз пень. Веснавое раўнадзенства — 03:06.

22. пт. Саракі. Было Новым годам / летам. Свята вясновага раўнадзенства. «Дзень з ноччу мераецца», «Святыя Саракі наперад пайшлі», «Святыя Саракі ў поле саху валаклі». Свята птушак. Прылятае 40 выраяў. **Пліска.** «На святога Пліска праб'ець лёд і пліска».

23. сб. *Зборава субота. Абрад «споведзі дзежкі». ***Зборніца, Ізбор.** Адзін з варыянтаў Новага года / лета пасля прыняцця юліянскага летазлічэння. «Святы Ізбор упярод ступіць». Пачатак збору селяніна ў поле.

24. н. **Пальмова (Вербна) нядзеля.* «Вярба б'е, не я б'ю».

25. п. Рыгор. «На Рыгора зіма ідзе ў мора».

26. а. Міжблагавешчыны (да 7 красавіка). Забарона на «запасванне» кароў.

30. сб. Аляксей Цёплы. Дзень рыбалова. «На Цёплага Аляксея рыба ідзе на нераст, карова на верас, а бортнік на хвою».

31. н. **ВЯЛІКДЗЕНЬ* у католікаў.

КРАСАВІК

1. п. Дар'я Вясенняя. Адбельвалі палотны.

2. а. Матрона. «На Матрону шчупак хвастом лёд разбівае».

5. пт. *Арына.* «На Арыну сей капусту ў рассадніках».

6. сб. Камаедзіца. Свята мядзведзя. **Благавеснік.** Пяклі пірагі «буславы лапы».

7. н. Благавешчанне. «Благавешчанне без ластавак — халоднае лета». Абрад «Страла».

8. п. *Пачатак Храстовага тыдня. Пяклі «храсты». Рабілі Засеўкі. Абрад «жаніцьбы коміна». **Благуста.** «На Благусту сей капусту». ***Дабравешчанне, Звеставанне.*** «І птушка гнязда не кладзе». Прылёт бусла. Гуканне вясны. Было Новым годам / летам. «Перша свята — нова летца, Благавешчан зямлю сушыць».

10. с. *Серадапосце. Выпякалі «храстцы».

14. н. Прабуджэнне хатніка. У гэты дзень хлусілі, каб заблытаць хатніка. «Апрэль — нікому не вер». **Мар'я.** Калі ў ясную ноч прыбывала вада, то суха будзе ў жніво на хлебнай ніве.

15. п. Пачатак ***Пахвальнага тыдня.** «Дзікая качка яйцом пахваліцца». **Палікарп.** «Пачатак бясхлебіцы».

16. а. Мікіта. «Калі на Мікіту крыгаход, то няма ні клёву, ні лову рыбаловам».

19. пт. *Пахвальная пятніца. Мыццё дзежак.

20. сб. *Пахвальная субота. Не грымелі кроснамі, каб гром не грымеў.

21. н. Руф. Руф рушыць снягі.

23. а. *Юры.* (Новы год па задыяку). «Першае святца — святы Юр'я», «Як зязюля закукуе за 12 дзён да Юр'я на «голы» лес, то не чакай ураджаю і будзе хварэць жывёла». ***Войцах.*** «Святы Вайцеху выпусціў жаўранка з меху».

24. с. Анціп — ахоўнік зубоў.

25. ч. *Марк.* «Дождж на Марка, дык зямля, як шкварка».

28. н. *Вербніца. Асвячалі вярбу, сцябалі ёю прыгаворваючы: «Не я б'ю, вярба б'е, за тыдзень — Вялікдзень». **Пуд.** «Пуд снег пугне».

29. п. Пачатак ***Белага, Вялікага, тыдня. *Чысты панядзелак.** Бялілі і мылі ў хаце. **Арына.** «На Арыну сей капусту на расаду».

30. а. *Чысты аўторак. Каб на людзей і «гаўядо» не напала «парша», трэба ўсё мыць. **Зосім** — ахоўнік пчол. **Андрыянава ноч, Андрэй.** Ноч дзявочай варажбы і чараўніцтва.

МАЙ (ТРАВЕНЬ)

1. с. *Дравяная страсць. Мыюць усё драўлянае. **Кузьма.** «Май Кузьма з морквінай сустракае, а Пахом з гурком».

2. ч. *Чысты чацвер. Ідуць у лазню. Абрад мыцця дзежкі.

3. пт. *Чырвоная, Велікодная пятніца. Сеялі гарох.

4. сб. *Вялікая, Чырвоная субота. Фарбавалі яйкі. Канец Вялікага посту.

5. н. *ВЯЛІКДЗЕНЬ. «Хрыстос уваскрос! — Сапраўды ўваскрос!». Быў Новым годам. «Першае свята — свята Вялікадня». Ляльнік. Свята Лялі — дачкі Лады. «Благаславі, маці, / Ой, Лада, маці! / Вясну заклікаці».

6. п. Працяг ***Вялікадня.** «Першы дзень пірагі маюць, а сярэдні (п.) пагуляюць, а паследні (а.) дзень выпраўляюць». У Жыткавіцкім раёне на другі дзень праводзілі свята сена. **Юр'е.** Свята жывёлы. «Як дождж на Юр'я — хлеб будзе і ў дурня». Абрад «Страла».

7. а. Алісей. «Прыйшоў Алісей — авёс пасей». Бабскія розбрыкі. Скокі жанчын і качанне па зямлі дзеля ўрадлівасці.

8. с. *Градавая серада. Праводны, Мёртвы тыдзень. «Пайшла зіма да Кіева, а лета нам пакінула». ***Людавы дзень.** Раней у Віленскай губерні білі і качалі яйцы з лубкоў, гушкаліся на арэлях. ***Станіслаў.*** «Сей лён на Станіслава — вырасце як лава». **Марк.** «Дождж на святога Марка — дык зямля, як шкварка».

9. ч. **Ушэсце.* Унебаўшэсце пана Езуса. Свята агляду жыта. ***Вялікадне мёртвых (Наўскі Вялікдзень, Мёртвы Вялікдзень, Наўскі чацвер).** Дзень памінання на могілках. Хлопцы і дзяўчаты абліваліся вадою.

10. пт. *Прашчэнне. Абліваліся вадою. Ярылавіца.

12. н. *Праводная нядзеля. «Ідзі, зіма, да Кучава, як ты нам надакучыла».

13. п. *Радаўнічныя Дзяды. Якуб. «На Якуба грэе люба».

14. а. *Радаўніца. «На Радаўніцу да абеду пашуць, па абеду плачуць, а к вечару скачуць». **Макарэй.** Абрады ля вады.

15. с. Барыс. Апякун поля і жывёлы.

18. сб. Арына Расадніца. Дзень высаджвання расады ў Паазер'і.

19. н. **Пяцідзясятніца* (Спасланне Святога Духа). ****Сёмуха, Зялёныя святкі, Святы Дух.*** Свята зелені. «На Духа будзе цёпла і суха». ***Міраносцы.** «На Міраносця п'яныі бабы цігаюць адна адну за валосця».

20. п. Антоній. «На святы Антоній сей авёс для коней, а як удасца, дык і прадасца».

21. а. Іван Веснавы. Апякун земляроба. «На Івана каласок, а на Пятра піражок».

22. с. Мікола Веснавы. Свята пастухоў. ***Алёна.*** «Сей лён на Алену, будзе кашуля па калена».

23. ч. Зілот. «Сей пшаніцу на Зілота, і яна будзе як злота».

24. пт. Макей. «Мокра на Макея — і лета не прасушыць». **Кірыла і Мяфод.** Калі дзень мокры — і лета будзе мокра.

25. сб. Епіфан. «На Епіфана раніца ў чырвоным каптане, неба з барваю — гарачае лета».

27. п. Пачатак ***Пераплаўнага (Чарвівага) тыдня. Сідары.** «Прыйшлі Сідары — прыйшлі і сіверы».

28. а. Пахом. «Святы Пахом павее цяплом», «Сей агуркі на Пахом — будзеш насіць мяхом».

29. с. *Градавая, Пераплаўная серада. Засцярогі ад граду і дажджу. ***Магдалена.*** «Магдалена зязюльку прысылае».

31. пт. Шэсць дзеў. «Лён сей позні». **Канапелька Матруна.** «Канапелька Матруна ў зямлю махнула». **Фядот.** «Як на дубе апушка — у Фядота поўна аўса кадушка».

ЧЭРВЕНЬ

2. н. Тры пакутнікі. «Няма лета, але пасля іх не бывае зімы».

3. п. Алёна, Ульяна. Дзень ільну.

4. а. Васіліск. «Ад Васіліска і салавей блізка».

5. с. *Градабойцы, Ледавіты дзень (Віленская губ.). **Дзень Ефрасінні Полацкай.** Хадзілі ў Полацк пакланіцца і абракацца.

7. пт. Ян. «Рой перад Янам — пчаляр будзе панам».

13. ч. *Ушэсце. Абрад «Страла». ***Антоній.*** «Антоні, аддай коні». **Ерамей.** «Прыйшоў Ерамей — больш не сей».

14. пт. Юстын і Харытон. «Юстын цягне ўверх каноплі, а Харытон — лён».

16. н. Лук'ян. Паўднёвы вецер на Лук'яна — на добры ўраджай яравых.

19. с. *Градавая серада.

20. ч. Летняе сонцастаянне — 20:50.

21. пт. Тодар. «На Тодара раса — канапель паласа».

22. сб. *Сёмушныя Дзяды. *Духавая субота, Зялёная субота. Свята маладой зеляніны. «Завівалі» вянкі, бярозкі. **Кірыла.** Пачыналі касавіцу ў Паазер'і.

23. н. *Сёмуха, Тройца. Культ продкаў і расліннасці. «Павядзём Куста пад гай зялёненькі...» ***Купала.*** У старажытнасці — Новы год / лета.

24. п. *Святы Дух. «На Святога Духа не скідай кажуха». Садзілі капусту і каноплі. ***Русальніца, Іван ды Мар'я.** Праводзіны вясны. «На Граннай нядзелі Русалкі сядзелі...» ***Ян Купальны.*** «Сонца грае».

25. а. *Конскі Вялікдзень. Свята коней. **Анапрэй.** «Хто на Нупрэя пасее грэч, той будзе бліны печ».

26. с. *Градабой, Серада Русаль. Здабывалі з ясеня святы агонь. **Акуліна Грачышніца.** Сеялі грэчку. **Задзярыхвост.** Каровы «зыкуюць».

27. ч. *Наўская Тройца, Абліваха. Памінанне продкаў на могілках.

28. пт. Амос. «Прыйшоў Амос — цягне ўгору авёс».

29. сб. Ціхан. «Пеўчыя птушкі заціхаюць». ***Пятрок.*** «Да Пятра зязюльцы кукаваці». «Прыйшоў Пятрок — апаў лісток, прыйдзе Ілья — ападуць і два».

30. н. *Русальчыны розыгры. Засцерагаліся рос. ***Пятроўскія запускі.** Развівалі вянкі.

ЛІПЕНЬ

1. п. *Пятроўка, Петравіца. Пятроўскі пост да 11 ліп. **Пятроўка-галадоўка.**

4. ч. *Дзявятнік. Перавод уніятаў у праваслаўе. «Дзеўяць ягодзін на галінцы».

5. пт. *Дзевятуха. Дзень засцеражэння ад навальніцы.

6. сб. Купалле. Свята Сонца і кахання. «Дзень адбаўленне, ночы прыбаўленне».

7. н. Іван Купала. «Учора была Купала, а сёння Іван».

8. п. *Данат.* «Святы Данат коскі точыць».

10. с. *Сем братоў.* «Сем братоў варожаць, колькі тыдняў пагоды». **Самсон.** «На Самсона дождж — сем тыдняў то ж».

11. ч. *Дзясятнік. «Дзясятнік гнаі возіць».

12. пт. *Дзясятка. «Косы точыць». «Жыта паспявае». **Пятро.** Свята заканчэння Купалля.

13. сб. Паўпятро. Дзень талакі. **Сымон і Юда.** «На Сымана й Юды конь баіцца груды».

14. н. Кузьма і Дзям'ян. Свята кавалёў. «Святы Пятро жыта спеліць, святы Кузьма сярпы робіць, а святы Дзям'ян сена грабе».

17. с. Андрэй. «Авёс у світцы, а на грэчцы і кашулі няма», «Андрэй усіх мудрэй».

18. ч. Свята Месяца. «Месяц гуляе».

21. н. Казанская, Градавы дзень. Засцераганне ад нябесных стыхій, ад хвароб вачэй і галавы. **Пракоп.** Пракоп бок прыпёк.

25. ч. *Якуб.* «На Якуба хлеба поўна губа». ***Прокл.*** Засцерагаліся вялікіх рос.

26. пт. *Ганна.* Снапы кладзе. **Гаўрылей.** Засцеражэнне ад граду. **Серпавіца, Шыпілінка** (пятніца перад Іллёю). Дзень «зазубрывання» сярпоў перад жнівом.

29. п. Афінаген. Заціхаюць птушкі.

ЖНІВЕНЬ

1. ч. Макрыны. «Глядзі восень па Макрыні».

2. пт. Ілля. Свята дажджоў і навальніц. «Ілля нарабіў гнілля», «Укінуў у воду кусок ільда».

4. н. Мар'я. «Магдалена — вады па калена».

6. а. Барыс, Палікоп. «Барыс і Глеб — паспеў хлеб». ***Перамяненне.***

7. с. Ганны. «Святы Ганны бабкі стаўляюць».

9. пт. Панцеляймон. Сцаляў ад хвароб галавы.

10. сб. *Лаўрын.* «На Лаўрына спяшай да млына».

12. п. Сіла. Жыта сей.

14. с. Макавей, Першы Спас. Свята маку і мёду. **Спасаўка. Пост** да 27 жніўня.

15. ч. *Прачыстая, Зельная.* «Прыйшла Прачыста — стала поле чыста». **Базыль.** «Базыль авечкам воўну дае».

16. пт. Антоны Віхравеі. Рох. «Кірмаш на паненак» — дзень выглядання нявест.

17. сб. Еўдакія. Агуркі збірае.

19. п. Яблычны Спас. Свята садавіны.

23. пт. Лаўрэн — свята млынара. «Баўтрамей і Лаўрын паказваюць, якая прыйдзе восень».

24. сб. *Баўтрамей.* «Святы Баўтрамей высылае буслоў па дзяцей», «Прыйшоў Баўтрамей — жыта на зіму сей».

27. а. Міхей. Выспяваюць брусніцы.

28. с. Прачыстая, Зельная. Свята ўраджаю.

29. ч. Трэці Спас. Свята хлеба.

30. пт. Міроны Ветрагоны. «Міроны Ветрагоны пыл па дарозе гоняць, па прыгожым леце стогнуць».

31. сб. Флор і Лаўр. Свята коней. **Ян.** «Ян на лета прыйшоў, а ўжо восень знайшоў». Арабінавыя дзень і ноч. Сухая навальніца або дождж.

ВЕРАСЕНЬ

5. ч. Лупа. «Сей на Лупа — будзе жыта купа».

7. сб. Баўтрамей. «Жыта на зіму сей».

8. н. *Другая Прачыстая.* «Меншая Прачыста — канчай сеяць начыста».

10. а. Мацей. Абаронца ад п'янства.

11. с. Калінавік, Іван Крываўнік. «Да Яна прасіце, дзеткі, дажджу, а па Яне я й сам упрашу».

13. пт. Кіпрыян. Журавель збіраецца ў вырай.

14. сб. *Узвіжанне.* Закрыванне зямлі. **Сымон.** Абрад «жаніцьбы коміна» (Асенняе Навалецце / Навагоддзе з 1493 г.). Бабіна лета.

19. ч. Цуды, Міхал. «Міхал з поля спіхаў».

21. сб. Багач, Нараджэнне Божае Маці. Свята заканчэння ўборкі зерневых. Засідкі.

22. н. Асенняе раўнадзенства — 12:43.

24. а. Тадора. «На Тадору ўсякае лета заканчваецца».

26. ч. Стаўроўскія Дзяды.

27. пт. Звіжанне. Свята закрывання зямлі на зіму. Гадзюкі збіраюцца ў кучу.

29. н. *Міхал.* «Калі на Міхала з поўначы вецер вее, то не май на надвор'е надзеі». **Сіцыян.** «Святы Сацыян ды ляны пасцілаў».

КАСТРЫЧНІК

2. с. Зосім. Журавіны на Зосіма ўздымаюцца — мароз на Пакровы ўдарыць.

4. пт. *Пранцішак, Францішак.* «На Пранцішка зярнят шукае ў полі мышка».

8. а. Сяргей. «З Сяргея пачынаецца зіма». Жалезны тыдзень. Чысцілі жалезныя рэчы.

9. с. Іван Шаптун, Іван Кураед, Багаслоў. Шапталіся свахі пра нявест. «Іван Багаслоў дружкі разаслаў, а на Пакрова дзеўка гатова», «Святы Багаслоў да буракі капаў».

14. п. Пакровы, Трэцяя Прачыстая. Вясельная пара. «Свята Пакрова, пакрый зямельку лісточкам, а галоўку — вяночкам», «Пакровы — зарыкалі каровы», «Калі на Пакрову маладзік, то будзе лёгкая зіма. З поўначы вецер — халодная зіма, з поўдня — цёплая». Дзявоцкае лета (па 21.10). Прымалі «ў дзеўкі» сяброўак.

21. п. *Зміцер.* «Да Змітра баба хітра». **Трыфан, Палагея.** «Золкім ветрам вее».

25. пт. Марцін — свята млынароў. Частаваліся гусяцінай на млынавым крузе. «Марцін святы — любіцель гагаты».

28. п. Сымон і Юда. «Сымон з Юдаю працу ў полі канчаюць, хаты аглядаюць». ***Параскева Пятніцкая.*** Забарона на прадзенне.

29. а. Лонгін. Збавіцель ад хвароб вачэй.

30. с. Паклоны. Дзень адбівання паклонаў.

31. ч. Лука. «Хто сее да Лукі, не будзе мець ні хлеба, ні мукі». Дзень іканапісцаў. ***Юльян*** — ахоўнік дзяцей.

ЛІСТАПАД

1. пт. *Усе Святыя.* «Усе Святыя як засваволяць — дрэвы да рэшты аголяць».

2. сб. *Задушны дзень.* Памінальны дзень. **Асяніны, Змітраўскія Дзяды.** «Святыя дзяды, завём вас...».

4. п. Казанская. «Да Казанскай — не зіма, а пасля — не восень; зранку дождж, з вечара — снег. Выязджай на Казанскую на калёсах, а палазы з сабой прыхапі».

8. пт. Зміцер. «Да Змітра дзеўка хітра». Канец надзеі выйсці замуж у гэтым годзе.

9. сб. *Тодар.* «На Тадора поўна камора».

10. н. Параскі. Апякунка жанчын і рукадзелля.

11. п. *Марцін.* «Мядзведзь кладзецца ў бярлогу». **Настуся.** Настуся стрыжэ авечкі.

12. а. Артошка. Пачатак прадзення.

14. ч. Кузьма-Дзям'ян. Апекуны земляробства, кавалёў і вяселля.

21. ч. Міхайлаў дзень. Абаронца ад грому. «Мядзведзі ідуць у спячку». «Міхайла ў інею — снежная зіма наступае, а калі туманамі спавіты — быць адлізе» (такія ж прадказанні і на Матрону).

22. пт. Матрона. «З Матроны становіцца зіма».

24. н. Хвёдар Студзянец. «Хвёдаравы вятры галоднымі ваўкамі скуголяць».

25. п. *Кацярыны.* «Кацярына забрала лета».

26. а. Іван Міласцівы. Дзень падарункаў.

27. с. Юстыніян. Апякун плоднасці і дзяцінства. **Піліп.** Пярэдадзень Піліпоўскага посту.

28. ч. Піліпаўка — перадкалядны пост (да 06.01).

29. пт. Мацей. «На Мацея зіма пацее».

30. сб. *Андрэйкі.* Дзявочае свята.

СНЕЖАНЬ

1. н. **Адвент.* Першая нядзеля.

4. с. *Барбара.* «Барбара ноч урвала, а дзень надтачыла». **Увядзенне.** Водзяцца ваўкі.

5. ч. Пракоп. *Савы.* «Барбара мосціць, Сава цвікі войстрыць, а Мікола прыбівае».

6. пт. *Мікола.* «Хвалі зіму па Міколе». **Матрыхваны.** Не пралі.

7. сб. Кацярыны. «Забрала край лета».

9. п. Юр'е Зімовы. Юра мосціць. ***Ганны.*** «Ад Ганны да Каляд два тыдні і два дні».

13. пт. Андросы, Андрэйкі. Варажылі.

14. сб. Навум. «Наставіць на вум». Пачыналі вучыць дзяцей грамаце.

17. а. Варвары. «Мікола і Варвара ноч урвалі».

18. с. Савы, Міколін бацька. «Сава мосце, а Мікола гвоздзе».

19. ч. Мікола Зімовы. «Без Міколы не бывае ні зіма, ні лета», «Мікола марозам гвоздзіць».

21. сб. Зімовае сонцастаянне — 09:20.

22. н. Ганны. «Ганны — прыбавіцца багата дня», «Ганкі — палічаны дзянькі».

24. а. *Посная куцця.* Пачатак Каляд (да 6 студзеня).

25. с. *Божае Нараджэнне.* Было Новым годам. «Свята Ражаство ўпярод пашло, Новы гадок павёў радок». **Спірыдон Сонцаварот.**

26. ч. *Сцяпан.* Дзень найму батракоў у мінулым. «На Святы Сцяпан кожны сабе пан».

31. а. *Багатая куцця. Сільвестр.* Варажылі дзяўчаты. **Марк.** «Марка да Варка — няхай будзе парка».

З АДНЫМ КУЛЬТУРНЫМ КОДАМ

Гутарка са старшынёй Беларускай канфедэрацыі творчых саюзаў і Беларускага саюза мастакоў Глебам ОТЧЫКАМ

Хоць беларускае мастацтва — адзіная прастора, творцы, якія ў ёй шчыруюць, належаць да асобных «цэхоў». Мастакі, пісьменнікі, кампазітары, музыкі, журналісты, дызайнеры, архітэктары, дзеячы тэатра і кіно, народныя майстры... Але ёсць суполка, якая больш за тры дзясяткі гадоў аб'ядноўвае ўсіх творчых людзей, — Беларуская канфедэрацыя творчых саюзаў.
Нядаўна адбыўся з'езд гэтай арганізацыі, якую ўзначальвае старшыня Беларускага саюза мастакоў Глеб ОТЧЫК. Мы сустрэліся, каб пагаварыць пра сённяшні дзень і будучыню канфедэрацыі, а таксама пра новыя праекты беларускага мастацтва.

— Кожны творчы саюз па-асобку ўсе ведаюць. А вось пра канфедэрацыю творчых саюзаў не ўсе, мабыць, і чулі...

— Сёння Беларуская канфедэрацыя творчых саюзаў злучае дванаццаць грамадскіх аб'яднанняў. Гэта самая вялікая творчая арганізацыя краіны, чыя задача — прадстаўляць інтарэсы саюзаў. Але, калі я ўзначаліў яе, аказалася, што маем шмат праблем — запазычанасці і гэтак далей. У савецкія часы ў канфедэрацыі мелася фінансаванне, калі скасавалі фінансавую падтрымку, яна засталася фактычна на паперы. Таму трэба аднаўляць яе статус. Першыя месяцы на пасадзе старшыні займаўся аналізам: што патрэбна, каб зрушыць гэтае вялікае кола, каб канфедэрацыя была не проста на паперы. Сёння мы робім анкетаванне, збіраем прапановы ад нашых саюзаў: што б яны хацелі ад дзяржавы, што для іх актуальна і ў якім кірунку рухацца. Правялі падчас Скарынаўскіх чытанняў круглы стол, цяпер плануем другі, каб скласці нейкі бюджэт, каб канфедэрацыя мела фінансавыя сродкі і магла ўплываць на культурныя працэсы, дапамагаць творчым аб'яднанням, каб яны адчувалі клопат і ад яе, і ад дзяржавы. Рыхтуем план дзейнасці на найбліжэйшыя пяць гадоў, распрацоўваем стратэгію. Для ўсіх творчых аб'яднанняў вельмі важны дыялог з прадстаўнікамі ўлады, каб чуць, што дзяржава хацела б ад нас і каб дзяржава ведала, якой падтрымкі ад яе хацелі б мы.

— Ці ёсць аналагічныя арганізацыі ў іншых краінах, у прыватнасці ў Расіі?

— Вядома. Наш саюз мастакоў на працягу дваццаці пяці гадоў уваходзіў у Міжнародную канфедэрацыю творчых саюзаў, на жаль, пару гадоў таму яна распалася. Ёсць падобная арганізацыя і ў Расіі. У нас прайшоў круглы стол з яе прадстаўнікамі, думалі стварыць з імі агульную канфедэрацыю, але пакуль на заканадаўчым узроўні гэта складана, у нас розныя законы аб грамадскіх аб'яднаннях. Згадаю і кітайскіх калег. Літаральна нядаўна мы сустракаліся з прадстаўніком такой арганізацыі, калі вялікая кітайская дэлегацыя прыязджала ў Беларусь. Канфедэрацыя творчых саюзаў у Кітаі вельмі ўплывовая, па значнасці ледзь не міністэрства. Таму нам ёсць да чаго імкнуцца, ёсць добрыя ўзоры.

— Канфедэрацыя — гэта патэнцыяльная магчымасць не толькі дапамагаць творчым саюзам, але і наладжваць супрацоўніцтва паміж прадстаўнікамі розных «цэхаў». Неаднойчы мы дыскутавалі пра недастатковую сувязь паміж творчымі пляцоўкамі — кампазітары не адсочваюць новыя праекты мастакоў, мастакі не ведаюць, што ствараюць сучасныя пісьменнікі...

— Сярод таго, што мы запланавалі, — па-першае, у чэрвені падрыхтаваць сумесную праграму да форуму рэгіёнаў, дзе ўсе творчыя аб'яднанні змаглі б выказацца. Па-другое, круглы стол, які плануецца падчас чарговых Скарынаўскіх чытанняў, таксама збярэ ўсіх творцаў пад адным дахам. Калі мы не будзем сустракацца, не будзем наведваць праекты калег — не ўсвядомім, хто куды рухаецца. Супрацоўніцтва дасць нам яднанне і разуменне агульнай беларускай культурнай прасторы. Падчас Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі ў Маладзечне здзяйсняем ідэю спалучыць музыкаў, спевакоў, паэтаў і мастакоў у супольных праектах. Дарэчы, мы практыкуем супрацоўніцтва не толькі паміж творцамі — з клубам веласіпедыстаў зрабілі вялікі праект «Кола жыцця». Выстава ў Палацы мастацтва перавысіла па колькасці наведнікаў Восеньскі салон — прывабіла незвычайнае спалучэнне філасофіі спорту і мастацтва. Плануем працягнуць праект і на наступны год. Яшчэ ёсць ідэя заснаваць з Міністэрствам культуры прэмію Беларускай канфедэрацыі творчых саюзаў, якая будзе ўручацца, можа, раз на тры гады ў розных намінацыях. Будзе адбывацца ў выглядзе фестывалю найлепшых дасягненняў творчых грамадскіх аб'яднанняў, дзе мы б дэманстравалі творы выяўленчага мастацтва, кнігі, тэатральныя пастаноўкі... Такая прэмія падняла б і статус канфедэрацыі, і дала штуршок да аб'яднання нашых творчых саюзаў для супольнай працы. Канешне, хацелася б, каб канфедэрацыя мела сваё памяшканне, дзе быў бы культурна-асветніцкі цэнтр, можа, нават не ў Мінску. Туды маглі б з'язджацца нашы калегі, праходзілі б стажыроўкі, мы б абменьваліся вопытам. Творчыя людзі прыходзілі б туды як да сябе дадому, прыносілі свае ідэі, каб гэтыя ідэі мы маглі даносіць да дзяржавы, да міжнародных структур. І каб кожны дзень там нешта адбывалася — канцэрты, выставы, тэатральныя пастаноўкі, паэтычныя вечарыны. Каб там віравала творчае жыццё... Гэта наша мара.

— Беларускіх творцаў мусіць аб'ядноўваць і беларускі культурны код... Ён адчуваецца ў вашых працах, дзе спалучаецца нацыянальная традыцыя і пошукі новых форм. Згадаю вашу карціну «Партал», дзе выява акна старасвецкай беларускай хаты і пазнавальная да дэталяў, і адначасова ўніверсалізаваная.

— Сёння ў беларускім мастацтве запоўненыя ўсе нішы, яно цалкам адпавядае сусветнаму ўзроўню, у чым я перакананўся, наведваючы скарбніцы культуры за мяжой. Наша краіна вельмі багатая не толькі прыроднымі рэсурсамі, але і здабыткамі культуры, нацыянальным генетычным кодам, які мы ў мітусні не заўважаем. Шкада, калі хтосьці пачынае пераймаць замежных майстроў, трацячы магчымасць ствараць нешта ўнікальнае, выкарыстоўваючы ўласны культурны код. Я вельмі ўдзячны бацькам, што яны мяне ў дзяцінстве на ўсё лета аддавалі ў вёску, дзе я далучаўся да гэтага кода. Мог гадзінамі глядзець на акно хаты, марыць... Чаму мая карціна называецца «Партал»? Тое акно — сувязь пакаленняў, бясконцы дыялог з Сусветам, у акне-партале можна разгледзець і крыж — знак веры, бо я памятаю, як мая бабуля малілася Богу, гледзячы ў акно... Я намагаюся сваёй творчасцю выказваць тое асабістае, што перажываю, сваё адчуванне Радзімы. І тады, калі ў Капылі да Дня беларускага пісьменства мы рыхтавалі праект, прысвечаны беларускаму алфавіту, і ў праекце «Пад знакам рыбы», які рабіўся падчас посту, дзе гучыць зварот да Бога... У кожным маім праекце ёсць нябачная ніць, якая звязвае з беларускім генетычным кодам, з нашай роднай зямлёй.

— Ведаю, што вы шмат эксперыментавалі, нават маянэзам малявалі... А вось да дапамогі штучнага інтэлекту звярталіся?

— На мой погляд, штучны інтэлект без мастацкай ідэі, без эмоцыі мастака — паравоз без вагонаў. Безаблічнае мастацтва. Калі мастак стварае — ён укладае ў твор сваю энергетыку. Вось, у маім кабінеце — пейзаж народнага мастака Віталя Цвіркі. Твор вельмі імпульсіўны, энергічны. Нават калі я стомлены прыходжу на працу — тры хвіліны дастаткова паглядзець на гэты пейзаж, і ты ўжо эмацыянальна напоўнены і маеш сілы. Энергетыку, якая прысутнічае ў творах, ні адзін штучны інтэлект не закладзе. Можа атрымацца прыгожая карцінка, правільна скампанаваная... Нядаўна мае сябры зрабілі мне ў падарунак пры дапамозе штучнага інтэлекту прыгожы кубак... Але п'еш з яго, а эмоцый ніякіх. А керамісты падарылі кубак, вылеплены ўласнымі рукамі, з любоўю — і кава з яго па-іншаму п'ецца. Так, мы можам падмяніць мастака, зрабіць прыгожы цэтлік, але сэнсавую напоўненасць, эмоцыю не заменім, штучны інтэлект гэта ніколі не дасць.

— Прамінулі Год гістарычнай памяці, Год міру і стваральнай працы, якія адлюстраваліся ў шматлікіх творчых праектах. Наступіў Год якасці... Што такое гэты год у прывязцы да творчых арганізацый?

— Я ўдзельнічаю ў шматлікіх міжнародных праектах і магу засведчыць, што паўсюль творчасць беларускіх скульптараў, мастакоў, керамістаў успрымаецца са знакам якасці. Нядаўна я быў у кітайскім горадзе Чанчунь, і тэлефануе мне кіраўнік магілёўскага філіяла Беларускага саюза мастакоў, з якім я на Беларусі ніяк не мог сустрэцца. Аказваецца, ён таксама ў Чанчуні. Вось так мы спаткаліся на поўначы Кітая — аказалася, яго таксама запрасілі на чарговы творчы конкурс. Я пытаўся ў кітайцаў: чаму вы кожны год запрашаеце столькі беларускіх мастакоў і скульптараў? Гавораць: гэта самыя надзейныя, самыя якасныя, самыя прафесійныя, таленавітыя і добрыя людзі. Адзначу, што такая ж ацэнка гучыць за мяжой на адрас і беларусаў іншых прафесій. Так што Год якасці — гэта таксама зварот да беларускага генетычнага кода, гэта наша нацыянальная рыса, наша нацыянальная бяспека. Але я хацеў бы яшчэ працягнуць і тэму стваральнай працы — зрабіць рэспубліканскі праект, у якім нашы творцы мастацкай мовай раскрылі б, чым жыве сёння працоўная Беларусь, расказалі пра розныя прафесіі — ад камбайнера да касманаўта.

— Калі я рабіла гутарку з народным мастаком Беларусі Іванам Міско, ён наракаў на адсутнасць дзяржаўных заказаў на тэматычныя карціны... Што значыць такі заказ?

— Дзяржзаказ — высокая планка. Як гэта павінна рабіцца... Напрыклад, мастакам прапануюцца тры тэмы — генацыд беларускага народа, падзеі 2020-га і патрыятычны вобраз Беларусі. На кожную тэму ад мастакоў збіраецца па сто эскізаў, камісія адбірае дзесяць, з кожным з дзесяці аўтараў заключаецца дагавор... Пасля мастаку даецца аванс на матэрыялы, а калі твор выкананы, з аўтарам разлічваецца дзяржава і праца пераходзіць у калекцыю Нацыянальнага мастацкага музея, ва ўласнасць Міністэрства культуры ці куды яшчэ... А заказ тыпу намаляваць царкву, пейзаж ці партрэт — гэта іншае, гэта лакальная задача.

— Ва ўсіх дзяржаўных установах культуры ўдзяляецца вялікая ўвага рабоце з сацыяльнымі сеткамі. Папулярызацыя арганізацыі, дыялог з наведнікамі, уменне прывабліваць увагу...

— Гэтага нам таксама не хапае, хоць многія мастакі паспяхова папулярызуюць сябе ў Facebook, Instagram. У Саюза мастакоў таксама ёсць свая старонка ў сацыяльных сетках, але там яшчэ не адбіваецца маштаб нашай працы. Я часта езджу па школах, сустракаюся са школьнікамі, яны вельмі цікавяцца, задаюць шмат пытанняў, але, кажуць, не ведалі пра наш саюз. А зацікаўленасць сапраўды вялікая. Калі мы абвясцілі Дзень адкрытых дзвярэй на нашым мастацкім камбінаце, прыйшло шмат людзей, у тым ліку вядомыя блогеры, і зацягнулася экскурсія на чатыры гадзіны. Можна зрабіць падобны праект і ў майстэрнях мастакоў, але трэба падтрымка гарадскіх улад з рэкламай і ўдзел саміх мастакоў. Хочам зрабіць сайт, дзе ў кожнага мастака была б не толькі яго біяграфія, але і зазнятая ў 3D яго майстэрня, загрузіць некалькі дзясяткаў твораў, якія ён мог бы прадаваць праз нашы галерэі.

— Акрамя абавязкаў старшыні дзвюх творчых арганізацый, ёсць і ўласная творчасць. Над чым працуеце?

— Мне давялося паўдзельнічаць у рэалізацыі мемарыяльнага комплекса Азарычы, на месцы канцлагера, і мяне вельмі захапіла гэтая тэма. За вельмі кароткі час, тры тыдні, зрабілі музейную экспазіцыю. Вельмі пранікнёную, па эмацыянальнай напружанасці параўнальную з той, што ў Хатыні. І калі я там працаваў, з'явілася задума твора. Я зрабіў эскізы, падрыхтаваў палатно, і хачу напісаць карціну, прысвечаную таму, што адбылося ў Азарычах. Яшчэ кожны год у нас праходзіць маладзёжны пленэр, і летась, калі адзначалася 70-годдзе нашага Міністэрства культуры, я прапанаваў прысвяціць пленэр архітэктурным помнікам. Тыдзень вандравалі па Беларусі са студэнтамі Акадэміі мастацтваў, маладзёжнай секцыяй Саюза... Усе ўдзельнікі напісалі па два творы — аб'ектамі натхнення сталі Жылічы, Юравічы, Брэсцкая крэпасць, Мірскі замак, Нясвіж... Калі вандравалі, я рабіў эскізы. А цяпер пішу серыю невялікіх карцін, прысвечаных тым архітэктурным помнікам... Адзінацццаць скончыў, яшчэ дзесяць засталося напісаць. І вось з гэтай дваццаці адной карціны хачу зрабіць невялікую выставу жывапісных пленэрных эцюдаў.

— А як Новы год сустракалі?

— Працаваў дапазна ў сваёй майстэрні на Някрасава, але калі сыходзіў, яшчэ ў дзвюх майстэрнях гарэла святло. Новы год сустрэў сціпла, без спіртнога, таму што вырашыў да першай каляднай зоркі, падчас посту, цягам трыццаці дзён не ўжываць алкаголь. У нашай сям'і так склалася, што самыя важныя святы — Вялікдзень і Раство. Прыехала сястра з Масквы, павіншаваў бацькоў... Праехаўся па горадзе... А раніцай ужо быў у майстэрні. Першым, хто мяне павіншаваў з Новым годам, быў колішні старшыня Саюза мастакоў Уладзімір Савіч, які сказаў: «Ты ведаеш, якое шчасце — раніцай першага студзеня трапіць у майстэрню!» Я сказаў, што таксама ўжо ў майстэрні... І гэта сапраўды шчасце.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Старонкі гісторыі

«ПАСЛЯ ПАЧАЎ... І ПРАРВАЛА! ЯК ЗАГРЫМЕЎ!»

Што адбывалася ў 1955 годзе на нарадзе маладых літаратараў

«Поехал я к Минским мурам, а там меня приняли гостинно и с бережением всяческим».

Так пісаў сябру малады настаўнік з «глыбінкі», які адпрацоўваў пасля размеркавання ў вясковай школцы. Ішоў 1955 год, згадваў настаўнік у лісце пра свой візіт на нараду маладых літаратараў, а звалі яго Уладзімір Караткевіч.

Калі працуеш з архіўнымі дакументамі, можна знайсці шмат нечаканага. Напрыклад, рукапіс артыкула вядомага паэта Анатоля Астрэйкі пад назвай «У секцыі паэзіі». Артыкул прызначаўся для публікацыі ў газеце «Літаратура і мастацтва» і датаваны вераснем 1955 года. Анатоль Астрэйка быў адным з кіраўнікоў Шостай рэспубліканскай нарады маладых літаратараў, якая прайшла ў Мінску, вось і выказваў свае ўражанні.

«ТРОШКІ ПРА ЎЗГОРКІ, ПРА ЖЫТА, ШТО ЯК ЛЕС ВЫРАСЛА...»

Тут трэба для непасвечанага чытача патлумачыць, што доўгі час менавіта нарады ці семінары маладых літаратараў давалі штуршок для творчага шляху сотням маладых. Збіраліся нарады дзесьці раз на год. Занятку ішлі па секцыях, кожную ачольвалі вядомыя пісьменнікі... Удзельнікі чыталі творы, адбывалася абмеркаванне, больш ці менш бурлівае... Знаёміліся адзін з адным і са старэйшымі. Звычайна пасля для найболей вартых былі прапановы публікацый, пачатковец уключаўся ў літпрацэс...

Цікава, што Анатоль Астрэйка напачатку дае свайму артыкулу назву «У секцыі крытыкі», потым перапрапаўляе на «паэзіі» — ці выпадковая памылка, ці з рэдакцыі «ЛіМа» памянялі «ўстаноўку»? Артыкул пісаўся проста «з калёс», то-бок на семінары, магчыма, Астрэйка проста пабачыў больш цікавае для выказвання менавіта ў паэтаў.

«На сённяшняй нарадзе прысутнічала шмат людзей. Тут больш чым сто пяцьдзясят чалавек. Маладыя пачынаючыя пісьменнікі, як прызвычаіліся мы зваць, хоць тут людзі ёсць пад трыццаць і за сорак год, хочуць параіцца, зрабіць сваю творчую справаздачу вядомым і паважаным паэтам і пісьменікам. Гэта натуральна. Каля паловы з раёнаў, з вёсак. І ім, бывае, калі асабліва пакуль з цярплівай здольнасцю, цяжка верыць сабе і свайму густу. І ў такіх людзей законнае імкненне — выслухаць праўду аб сваім творы вопытнага майстра», — аптымістычна пачынае Анатоль Астрэйка.

Але далей тон робіцца з'едлівым:

«Як ужо гаварылася, на нарадзе шмат людзей. Яшчэ больш іх не прысутнічае. Але агульнае ўражанне ад секцыі паэзіі ўвесь час было сумнае. Сказаць, што Саюз пісьменнікаў не рыхтаваўся да гэтай творчай канферэнцыі — нельга... Аднак жа слухаць было мала што. У чым жа справа? Чаму так атрымалася? Ці народ не любіць дасціпнае трапнае слова ці добры тэкст да песні?

А справа ў тым, што патрабаванне нашага народа вырасла. Што было цярпіма і з горам папалам прыемлема некалькі год назад, зараз яно пройдзены ўжо этап. І пісаць, ды ў большасці нязграбна пра сённяшні дзень, калі ён ужо на выходзе, а чалавек піша толькі пра раніцу яго, — значыць адставаць ад жыцця народа, ад яго поступу наперад, у заўтрае».

Анатоль Астрэйка славіўся як майстар сатыры — недарэмна ў час вайны ён быў адказным сакратаром сатырычнай газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну», а пасля вайны адказным сакратаром часопіса «Вожык». Вось і дасціпнае:

«Большасць галасоў на секцыі паэзіі не гучалі. Гэта былі ў асноўным перапевы даўно вядомых ісцін, штамп, які ўсталяваўся: трошкі пра ўзгоркі, пра жыта, што як лес вырасла і жоўтымі хвалямі коціцца ўдаль. Ці пра каханне: ён нясмелы і ніяк не набярэцца адвагі пацалаваць каханую, і яна злуецца ці саромеецца. Пры гэтым атрыбуты гэтага кахання: вярба, бяроза, бераг ракі і абавязкова месяц і зоры. То зоры, што як цвікі з срэбнымі шапачкамі набіты ў небе, то зоры, што трымцяць на косах дзяўчат ці на траве. А пачуцця свайго слова, сваіх адносін да гэтых вербаў і зор няма».

ПАЭТ СА СВАІМ ГОЛАСАМ

Наракае крытык, што вершы паэтаў нельга было адрозніць, як братоўблізнюкоў. Называе і канкрэтныя імёны, многія з якіх для нас сёння сталі імёнамі вядомых літаратараў. Не баіцца злога гумару: *«Смехам адказвала зала, калі Клімянкоў, паўтараметровы чалавек, называў лісцё лісцейкам, кветку — кветачкай, а пчалу пчолачкай, а Святлану — Святланачкай. Гэтая Святлана, каб ведала, што ён так мізэрнічае, яму і рукі б не падала»*.

Астрэйка называе і тых, хто займаўся з маладымі: Максім Танк, Аркадзь Куляшоў, Пятрусь Броўка, Пятро Глебка. Згадвае, як Танк, паслухаўшы Міколу Арочку, узяў слова, бо «ў гэтым маладым паэце ўбачыў чалавека, які можа пісаць цікава, па-свойму». Танк выбраў са сшытка Арочкі пяць перспектыўных вершаў. Кастусь Кірэенка і Максім Лужанін далі майстар-клас па выпраўленні хібаў у паэтычных радках Кастусю Цвірку і Уладзіславу Нядзведскаму.

А вось урывак, які гаворыць аб паэтычным чуцці самога Анатоля Астрэйкі:

«Прыемнае ўражанне на прысутных зрабіў малады паэт Ул. Караткевіч. Яго вершы «Машэка», «Орша» і інш. атрымалі высокую ацэнку. У асобе Караткевіча мы маем сапраўды здольнага паэта, які з першых сваіх твораў загаварыў сваім голасам. Няхай гэты голас яшчэ не зусім поўны, але ён упэўнены і моцны. У літаратуру ідзе чалавек, які можа ўзбагаціць нашу паэзію сваёй эпікай, сваімі тэмамі».

«ВЫШЕЛ ПЕРЕД СТОЛОМ НИ ЖИВ НИ МЁРТВ...»

Як засведчыла гісторыя, Астрэйка не памыліўся ў сваёй ацэнцы.

У сваю чаргу, і для Уладзіміра Караткевіча тая нарада стала знакавай падзеяй. 7 кастрычніка 1955 года ён піша свайму сябру Юрыю Гальперыну (менавіта з цытаты з гэтага ліста я і пачала артыкул): *«Приём действительно был чудесным. Как я благодарен этим людям — если бы ты мог знать! ...Я сначала решил было не читать на секции, а потом подумал: «Зачем я летел самолетом». Попросился через Корбана и он меня всунул на последнее заседание, прямо с ходу. Читал «Оршу», «У хаце прытульна», «За рэчанькай» и новую, еще малость недоработанную «Баладу пра варону». Вышел перед столом ни жив ни мёртв и сначала раза два хватанул воздуха. Потом начал и... прорвало. Как загремел! Хоть святых выноси. И всё мне кажется, что все сидят мрачные и не смотрят на меня. Ну, думаю, конец. Кончил — и все долго молчали. А потом кто-то: «Рецензента у него нет? Выступил неожиданно? Ну, оно и к лучшему. Пусть остаётся впечатление». И Танк: «Что казаць! Няма чаго казаць. Добра!»...*

Если бы ты знал, как я был глупо счастлив...»

Уражанні ад нарады Караткевіч выказаў і ў лісце да другога свайго сябра, Леаніда Крыгмана, 30 кастрычніка таго ж года. З ліста вынікае, што дзякуючы таму, што Караткевіч пабываў сярод аднадумцаў, у беларускамоўным асяродку, ён зрабіў выбар на карысць беларускай мовы ў творчасці:

«Я, кажется, обмолвился тебе, что был в Минске на совещании молодых, видел много интересного, говорил со многими интересными людьми, читал некоторые стихи и читал, не хвастаюсь, с большим успехом.... А по-русски писать решил бросить. Это не нужно. Нужно было среди людей, которые по-белорусски не понимают, а теперь ведь есть другие, и есть, прямо говоря, твёрдая цель. Хвалили за отсутствие декларативности, так что снижение брака — по боку».

12 лістапада 1955 года Караткевіч піша Максіму Танку, рэдактару часопіса «Полымя»:

«Перад ад'ездам з нарады мне шмат хто казаў, каб я ў сябе не проста так сядзеў, а ўсё ж пасылаў нешта, і хоць як мне нязручна, але я вырашыў паслаць. Доўга капаўся, давялося шмат перарабляць, і толькі цяпер вырашыў, што яны хоць чалавечы выглядаюць. Адабраў 11 вершаў, адзін верш у прозе і невялічкую паэмку».

І зноў згадвае, як паўплываў на яго ўдзел у нарадзе:

*«Якую вы справу добрую зрабілі для мяне і як я вам удзячны за гэта. І Цімахвею Васільевічу (Вітку. — **Л. Р.**), і Уладзіміру Іванавічу (Корбану. — **Л. Р.**), і тт. Зарыцкаму і Няхаю, і ўсім-усім. Гэта, ведаеце, упэўненасць, Цяпер я ўжо не кіну. Так хочацца працаваць, і адчуваю сябе нейкім новым, іншым»*.

Публікацыя ў часопісе «Полымя» адбылася. А праз год Уладзімір Караткевіч атрымаў рэкамендацыі для ўступлення ў Саюз пісьменнікаў — яшчэ да выхаду першага зборніка. Аўтарамі рэкамендацый былі Максім Лужанін, Антон Бялевіч і Анатоль Вялюгін, усе яны працавалі з маладымі паэтамі на Шостай рэспубліканскай нарадзе маладых літаратараў.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

На вялікім экране

НІКОМУ НЕ ДАГНАЦЬ «ЧАБУРАШКУ»!

За мінулы год у кінатэатрах сталіцы адбылося 1855 сеансаў беларускага кіно, сярод якіх 786 сеансаў ігравых кінастужак, 609 сеансаў дакументальнага кіно і 460 сеансаў анімацыі. А па выніках пракату ўсіх карцін, якія паказвалі на вялікім экране ў Мінску, пяцёрку лідараў склалі «Чабурашка», «Аватар: шлях вады», «Опэнгеймер», «На другім беразе» і «Кот у ботах 2. Апошняе жаданне».

— Штогод сетка кінатэатраў Мінска дае пляцоўку для паказу беларускіх фільмаў. У 2023 годзе ў нас прайшлі прэм'еры такіх беларускіх карцін, як «Ліст чакання» народнага артыста Беларусі, рэжысёра Аляксандра Яфрэмава, якая распавядае пра ўрачоў-кардыёлагаў нашай краіны, іх працоўныя і сямейныя ўзаемаадносіны; поўнаметражны дэбют «Кіношнікі» рэжысёра Кірыла Халецкага, дзе галоўны герой таксама малады рэжысёр, які марыць рабіць аўтарскае кіно, а замест гэтага павінен працаваць у архівах кінастудыі; і галоўная нацыянальная прэм'ера мінулага года — фільм «На другім беразе» рэжысёра Андрэя Хрулёва, які расказвае пра цяжкія для нашай краіны падзеі перыяду польскай акупацыі, стужка займела вялікі поспех у гледача, — расказвае **першы намеснік генеральнага дырэктара кінавідэапракату Мінгарвыканкама Вольга ДЗЮЛЬДЗЯ**. — Многія беларускія фільмы былі прадэманстраваны ў рамках тэматычных мерапрыемстваў і праектаў, прысвечаных грамадска-патрыятычнаму выхаванню моладзі. Такія праекты, як «З любоўю ў сэрцы да Беларусі», кінаакцыі і кінаўрокі гісторыі «Мы беларусы, мірныя людзі», мерапрыемствы, прысвечаныя Году міру і стваральнай працы, праграмы ў рамках шостага школьнага дня «Кіно глядзім разам», дазволілі зрабіць акцэнт на беларускае кіно і паказаць такія фільмы нашай вытворчасці, як «Дзяўчынка шукае бацьку», «Іван Макаравіч», «Мама, я жывы», «Вам заданне», «Падрыў» і іншыя.

Яшчэ ў кінатэатрах адбыліся паказы фільма «200 крокаў пад зямлёй» — гэта дакументальная драма, прысвечаная аднаму з самых неверагодных эпізодаў супраціўлення жыхароў Беларусі нацысцкім акупантам, расказвае пра навагрудскіх яўрэяў, якія змаглі зладзіць уцёкі з гета і папоўніць рады партызан. Прэм'ера кінастужкі «Аляксандр Кішчанка. Касмічная Адысея» была прымеркавана да 16-годдзя студыі гістарычных фільмаў «Майстэрня Уладзіміра Бокуна». Магчымасць далучыцца да прагляду на вялікім экране кінастужак з самых розных куткоў свету даў летась XXIX Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад». Паказы конкурсных і пазаконкурсных фільмаў, творчыя сустрэчы адбываліся ў кінатэатрах «Дом кіно», «Піянер», «Цэнтральны» і «Беларусь». Карціны праграмы «Лістападзіка» дэманстраваліся ў «Піянеры».

Асобна спецыяліст спынілася таксама на тым, якія кінастужкі расійскай вытворчасці выклікаюць інтарэс у сталічнай публікі. «Акрамя фенаменальнага поспеху фільма «Чабурашка», пра які на пачатку мінулага года шмат гаварылі ў СМІ, увагу гледачоў прыцягнула экранізацыя вядомай казкі «Па шчупаковай волі» і сучаснай казкі «Баба-Яга ратуе свет». Не пакінуў абыякавымі аўдыторыю і фільм «Выклік», які стаў першай кінастужкай, знятай у космасе. Цікавай для гледачоў была таксама кінастужка «Праведнік», якая знаёміць з гісторыяй і подзвігам афіцэра Чырвонай Арміі Мікалая Кісялёва ў гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі беларускіх зямель. Усе пералічаныя фільмы дазваляюць сцвердзіць, што сучасны расійскі кінематограф, акрамя палепшанага тэхнічнага складніка, нясе ў сабе ідэі дабра, гуманізму, нагадвае пра ключавыя моманты нашай гісторыі, якія мы не павінны забываць», — адзначыла Вольга Анатольеўна.

А што датычыцца сітуацыі з кінапракатам на пачатак 2024 года, то першыя месцы па колькасці наведвальнікаў сталічнай кінасеткі займаюць таксама расійскія карціны «Халоп 2», «Брэменскія музыканты» і «Тры багатыры і Пуп змлі». Але ўсё ж ім, на меркаванні Вольгі Дзюльдзі, не дагнаць па зборах «Чабурашку» з яго мінулагоднім поспехам у пракаце. Калі казаць пра фільмы, выхаду якіх шырокая аўдыторыя можа чакаць сёлета, то найперш кінапракатчыкі рыхтуюцца да рэалізацыі праектаў, прысвечаных 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, і праектаў з нагоды 100-годдзя беларускага кіно. Вядома, сярод чаканых падзей і XXX ММК «Лістапад». З прэм'ер беларускай вытворчасці на 2024 год намечаны паказы фільмаў «Казбек», «Чорны замак Альшанскі», анімацыйнай кінастужкі «Песні Сірын». Расійскія кінавытворцы прадставяць у мінскіх кінатэатрах ваенную драму «Паветра», экранізацыю рамана Булгакава «Майстар і Маргарыта», экранізацыю казкі «Лятучы карабель», працяг франшызы «Лёд», а таксама экранізацыі аповесці Кіра Булычова «Сто гадоў таму наперад» і рамана ў вершах Аляксандра Пушкіна «Яўгеній Анегін», і ўжо бліжэй да канца года варта чакаць выхаду спін-офа папулярнай франшызы «Апошні багатыр. Фініст — першы багатыр» і прыгодніцкага фэнтэзі «Чараўнік Смарагдавага горада».

Алена ДРАПКО.

ЧАМУ НАВУКА ЗАЎСЁДЫ ПЕРАМОЖЦА?

Разбіраемся з дырэктарам РНПЦ спорту

У 2024 годзе РНПЦ спорту адзначыць свой 10-гадовы юбілей. За гэты час спецыялісты цэнтра выратавалі нямала спартыўных кар'ер і дапамаглі сотням спартсменаў стаць чэмпіёнамі. І, як належыць у спорце, ніколі не спыняюцца на дасягнутым. У пачатку юбілейнага года дырэктар Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра спорту Ірына МАЛЁВАНАЯ расказала пра найважнейшыя навуковыя перамогі цэнтра.

«Сучасны спорт — гэта спаборніцтвы тэхналогій. Чалавечыя рэсурсы як такія ўжо даўно вычарпаны. Спаборніцтвы ў рамках самых першых Алімпійскіх гульняў праходзілі па відах, звязаных з асноўнай дзейнасцю чалавека: бег, кіданні, скачкі. Сёння ж спартыўных дысцыплін вельмі шмат і часта прыродных рэсурсаў арганізма недастаткова, каб у іх быць найлепшым. Сёння спартсмену трэба дапамагаць: сачыць за яго фізічным станам, каб цела працавала максімальна, аказваць яму псіхалагічную дапамогу. Таму спорт вышэйшых дасягненняў немагчымы без навукі», — сцвярджае Ірына Малёваная.

Уся спартыўная навука Беларусі сканцэнтравана ў сценах РНПЦ спорту. І адным спортам яна не абмежавана. Як расказвае Ірына Малёваная, спартыўная навука апрабуе методыкі, якія прымяняюцца ў прафесіях, што прадугледжваюць экстрэмальную дзейнасць. Сярод пацыентаў РНПЦ спорту — палярнікі, шахцёры, пажарныя, вайскоўцы і многія іншыя людзі, чыя служба і небяспечная, і цяжкая. Спартыўная навука не баіцца выклікаў, менавіта на спартыўным кантынгенце адпрацоўваюцца пілотныя, зусім інавацыйныя праекты. Спартыўная навука — галіна закрытая, але ад гэтага цікавая, бо яна дакладна ведае, на што насамрэч здольны чалавек.

АДУКАЦЫЙНАЯ МАДЭЛЬ

Спартыўны ўрач — мультыфункцыянальны спецыяліст, для якога ў медыцыне сакрэтаў быць не павінна. Такі спецыяліст павінен валодаць не толькі асноўнымі медыцынскімі ведамі, але і разумець, як арганізм рэагуе на высокія фізічныя і эмацыянальныя нагрузкі. А гэта зусім іншыя дыягназы, іншае лячэнне і іншыя падыходы. Часта спартыўны ўрач працуе адзін у нацыянальнай камандзе. І ён павінен быць на ўсе рукі майстрам: умець правільна паставіць дыягназ, аператыўна аказаць першую дапамогу, пры неабходнасці правесці рэанімацыйныя мерапрыемствы, ведаць спартыўную фармакалогію, разбірацца ў спартыўным харчаванні, валодаць навыкамі лячэбнага масажу. Урач, які працуе з нацыянальнай камандай, павінен разбірацца ў спецыфіцы віду спорту. Словам, спартыўны ўрач павінен умець усё і нават больш. Пакуль у медыцынскіх універсітэтах такіх майстроў на ўсе рукі не рыхтуюць. Таму РНПЦ спорту ўзяў падрыхтоўку навуковага і кадравага рэзерву ў свае рукі. «Я рада анансаваць, што ў нас заканчваецца фарміраванне поўнага цыкла адукацыі па спартыўнай медыцыне. Аналагаў гэтага поўнага цыкла няма ў свеце. Таксама мы выдаём абітурыентам мэтавыя накіраванніі для навучання ў медыцынскіх універсітэтах краіны. Дзякуючы Міністэрству аховы здароўя нам аддалі інтэрнатуру па спартыўнай медыцыне. Гэта значыць, выпускнік медінстытута на працягу года праходзіць стажыроўку на нашай базе. І па выніках яму выдаюць дыплом урача спартыўнай медыцыны. Да гэтага такі дыплом можна было атрымаць толькі пасля перападрыхтоўкі. У нас адкрыта клінічная ардынатура для ўрачоў спартыўнай медыцыны. На базе РНПЦ праходзіць мноства стажыровак па розных кірунках спартыўнай медыцыны. Яны вельмі запатрабаваны ў нашых калег з Казахстана, Туркменістана, Узбекістана, Расіі і нават Кітая. У 2024 годзе да дзесяцігоддзя РНПЦ мы плануем адкрыць адукацыйны цэнтр, на базе якога будзем праводзіць павышэнне кваліфікацыі па спартыўнай медыцыне», — расказвае Ірына Малёваная.

КОМПЛЕКСНАЕ ТЭСЦІРАВАННЕ СПАРТСМЕНАЎ

Спецыялісты РНПЦ спорту ведаюць аб атлетах нават больш, чым яны самі. Гэта магчыма дзякуючы комплекснаму тэсціраванню, якое на базе РНПЦ у абавязковым парадку праходзіць кожны беларускі спартсмен. Ірына Малёваная прызнаецца, што гэты праект — вялікі гонар цэнтра. Аналагаў такой мадэлі няма нідзе. «У мінулым годзе пры падтрымцы Міністэрства спорту мы стварылі сістэму навуковага тэсціравання ў спорце вышэйшых дасягненняў. Цяпер усе члены нацыянальных каманд па ўсіх відах спорту абавязаны штогод (часцей за ўсё ў пачатку макрацыкла падрыхтоўкі) праходзіць комплекснае навуковае тэсціраванне. Раз на тры-чатыры месяцы спартсмены праходзяць тэсціраванне па асобных кірунках. Яно неабходна, каб адсачыць, як спартсмен рэагуе на нагрузку. Калі спартсмен выходзіць на пік формы, такое тэсціраванне можа праводзіцца кожны дзень ці нават некалькі разоў на дзень. У гэты перыяд трэба быць вельмі акуратнымі, каб не перагрузіць спартсмена», — тлумачыць Ірына Малёваная.

Такое тэсціраванне дае поўную карціну аб стане спартсмена, што вельмі важна для трэнера, які выбудоўвае сістэму падрыхтоўкі. Ацэнка самаадчування самім спартсменам — рэч суб'ектыўная, бо ў імкненні да вышэйшага выніку ён можа трываць, працуючы на мяжы магчымасцяў. А бываюць і тыя, хто можа дазволіць сабе ленавацца і моцна перабольшвае сваю стомленасць. Але навуку не падманеш. Паводле слоў Ірыны Малёванай, спецыялісты беларускага РНПЦ спорту праштудзіравалі каля 5 тысяч навуковых даследаванняў на гэту тэму і з дапамогай спецыяльных праграм адабралі каля 150 самых дакладных.

Дырэктар РНПЦ спорту адзначае, што раней многія трэнеры і спартсмены не асабліва гарэлі жаданнем праходзіць такія тэсціраванні, спасылаючыся на недахоп часу, сваё выдатнае самаадчуванне і мноства іншых прычын. Але вынікі комплекснага тэсціравання трэнеры атрымліваюць у даступнай для разумення форме, дзе дакладна прапісана, над чым варта старанна папрацаваць, а з чым праблем няма. І калі раней трэнерам і спартсменам даводзілася тлумачыць, што праходзіць комплекснае даследаванне — у іх інтарэсах, то сёння яны ўжо самі жадаюць праверыць свой стан. Больш за тое, федэрацыі па відах спорту просяць праводзіць такое даследаванне для спартыўнага рэзерву. Па словах Ірыны Малёванай, выканкам Нацыянальнага алімпійскага камітэта падтрымаў фінансаванне гэтага праекта. Такім чынам, Беларусь — адзіная краіна, дзе нарматыўна замацаваны абавязак спартсменаў праходзіць комплекснае навуковае тэсціраванне. І Беларусь — адзіная краіна, дзе такое тэсціраванне праходзяць маладыя спартсмены.

ДНК-СХОВІШЧА

У РНПЦ спорту захоўваецца генафонд беларускага спорту. У ДНК-сховішчы сабрана каля трох тысяч узораў генетычнага матэрыялу беларускіх спартсменаў. «Мы пайшлі па шляху прыкладной выбарчай генетыкі. Праводзім генетычныя даследаванні пэўных параметраў, якія цікавыя тут і цяпер. Прывяду прыклад: рыхтуючыся да Алімпійскіх гульняў у Токіа, мы разумелі, з якімі цяжкасцямі там давядзецца сутыкнуцца. Таму, выкарыстоўваючы матэрыялы са сховішча, мы вызначалі генетычную адчувальнасць нашых спартсменаў да нізкага ўтрымання кіслароду ў паветры, каб пазбегнуць гіпаксіі. Вызначалі хуткасць засваення глюкозы, таму што ў Токіа адпрацоўваліся новыя фарматы, калі паўфіналы і фіналы ў некаторых відах праходзілі ў адзін дзень. Зразумела, што спартсмен цэлы дзень у напружанні, не можа нармальна есці, яму патрэбны дабаўкі. І па выніках гэтых даследаванняў кожнаму ўдзельніку Алімпіяды выдавалі адпаведныя рэкамендацыі», — расказвае Ірына Малёваная.

ДНК-сховішча дазваляе праводзіць даследаванне стану спартсмена без яго непасрэднай прысутнасці. ДНК-сховішча — шырокае поле для даследчай дзейнасці. «У нас захоўваюцца генетычныя матэрыялы нашых вялікіх спартсменаў, якія можна параўноўваць з узорамі моладзі. Адна маладая біятланістка мае падобныя параметры па максімальным спажыванні кіслароду з Дар'яй Домрачавай. Вядома, мы паведамілі трэнеру, што яна можа вытрымаць такія ж нагрузкі, якія вытрымлівала Дар'я», — прыводзіць прыклад Ірына Малёваная.

УНІКАЛЬНЫЯ АПЕРАЦЫІ

У 2022 годзе ў РНПЦ спорту ўпершыню выканалі артраскапічную аперацыю на каленным суставе. І гэта быў сапраўдны прарыў. Ірына Малёваная тлумачыць, што такія аперацыі праводзяцца малаінвазіўным спосабам. Груба кажучы, усе маніпуляцыі праводзяцца праз маленькую дзірачку, нагу пацыента разрэзваць не трэба. Для спартсменаў гэта сапраўднае выратаванне. Бо пасля адкрытых аперацый трэба 8-10 месяцаў на аднаўленне, губляць столькі часу спартсмен не можа.

Аперацыі ў РНПЦ праводзяцца пад мясцовай анестэзіяй, арганізм не адчувае стрэсу ад агульнага наркозу. «Падобныя аперацыі мы праводзім раніцай, а пасля абеду ўжо адпускаем пацыента дадому. Адразу ж пасля аперацыі яго аглядае рэабілітолаг, які складае план рэабілітацыі. Цяпер мы аперыруем каленны і галёнкаступнёвы суставы. У найбліжэйшы час возьмемся за плечавы і тазасцёгнавы», — расказвае Ірына Малёваная. Можна толькі ўявіць, якога прафесіяналізму патрабуе такая ювелірная работа. Але той факт, што чарга на падобныя аперацыі распісана на два месяцы наперад, гаворыць сам за сябе. Дарэчы, у РНПЦ спорту такія аперацыі на пазабюджэтнай аснове могуць зрабіць усім ахвотным.

СТАМАТАЛАГІЧНАЕ АДДЗЯЛЕННЕ

Чалавечы арганізм — з'ява найцікавейшая. Мала хто можа падумаць, што на спартыўныя рэзультаты можа паўплываць стан зубоў. Аказваецца, яшчэ як можа. Менавіта таму ў РНПЦ спорту працуе стаматалагічнае аддзяленне. «Праблемы з зубамі для спартсменаў — калі не першая, то другая праблема дакладна. Спартсмены часта адчуваюць вялікую напругу, што адбіваецца на стане арганізма, пакутуе мікрафлора кішэчніка, скуры і поласці рота. Таму спартсмены вельмі адчувальныя да карыесу. Каля 30 працэнтаў нацыянальных каманд маюць такую праблему. У многіх відах спорту не рэдкасць траўмы сківіцы», — тлумачыць Ірына Малёваная. І адкрывае зусім ужо дзіўныя рэчы. Аказваецца, стан сківіцы непасрэдна ўплывае на стан апорна-рухальнага апарату. «Ад напругі спартсмен моцна сціскае зубы, яны сціраюцца, гэта змяняе прыкус. Змены прыкусу ўплываюць на паставу, а змена паставы можа перакрываць дыхальныя шляхі. Спартсмен пачынае горш дыхаць, як вынік памяншаецца цягавітасць і падае рэзультат. З дапамогай спецыяльных кап, стаматалагічных методык прыкус прыводзяць у норму, і спартсмен пачынае дыхаць на поўныя грудзі ў прамым сэнсе гэтага слова. У аднаго з нашых плыўцоў была такая праблема. Нашы спецыялісты яе вырашылі, і вынік заўважна палепшыўся. «Я не плыву, а лячу», — казаў ён потым свайму доктару. Няправільны прыкус уплывае на біямеханіку спартсмена. Гучыць, магчыма, фантастычна, але гэта навуковая рэальнасць. На жаль, раней у нас такіх спецыялістаў у краіне не было. Але сёння стаматалагічны кірунак у спартыўнай медыцыне набірае абароты. І мы, вядома, не адстаём. Таму стаматолаг, біямеханік і траўматолаг у нас працуюць адзінай камандай», — паведамляе дырэктар РНПЦ спорту.

ЗАМЕСТ ЗАКЛЮЧЭННЯ

Спорт — гэта праца на мяжы чалавечых магчымасцяў. Але ці існуе гэтая мяжа? У Ірыны Малёванай навукова-філасофскі погляд на гэта: «Чалавек — вельмі няпростае стварэнне. Мяжа чалавечых магчымасцяў велізарная. Пры каманднай рабоце спецыялістаў і правільным навуковым падыходзе чалавек можа выносіць вялікія нагрузкі і станавіцца толькі лепшым, а значыць, няма мяжы дасканаласці».

Валерыя СЦЯЦКО.
Фота НАК Беларусі і РНПЦ спорту.

Аліна ЗМУШКО:

«ЯКІМ БЫ ТЫ НІ БЫЎ АДОРАНЫМ, НА ТРЭНІРОЎКАХ ТРЭБА ЎКАЛВАЦЬ. МНЕ НІКОЛІ ПРОСТА ТАК НІЧОГА НЕ ДАВАЛАСЯ»

На этапе Кубка свету па плаванні, які прайшоў у кастрычніку, Аліна Змушко заваявала бронзавы медаль на дыстанцыі 50 метраў брасам. Гэты медаль стаў нядрэнным задзелам для падрыхтоўкі да чэмпіянату свету, які пройдзе ў лютым. «Мая галоўная матывацыя — гэта вынік. Калі ён стаіць на месцы, мне вельмі цяжка. Але калі я дадаю, у мяне з'яўляюцца сілы і жаданне працаваць больш», — дзеліцца Аліна Змушко. Здавалася б, такія развагі пра матывацыю — проста прыгожыя словы спартсмена для інтэрв'ю. Але не ў выпадку Аліны. Яе любімы занятак — устанаўліваць нацыянальныя рэкорды па плаванні брасам. Няводны яе рэкорд не становіцца «вечным», яна ўвесь час пераўзыходзіць уласны найлепшы вынік, павышаючы планку нацыянальных рэкордаў. Для заўзятараў і журналістаў гэта неверагодна прыгожая гісторыя. Але толькі сама Аліна і яе трэнер Ігар Макееў ведаюць, што за гэтым стаіць. У інтэрв'ю «Звяздзе» Аліна Змушко прыадчыніла заслону спартыўнага жыцця.

— Аліна, самае актуальнае пытанне: як вярнуцца на міжнародныя старты і прычым адразу заваяваць медаль?

— Калі шчыра, то падчас падрыхтоўкі да этапу Кубка свету я нават не думала аб медалі, я проста радавалася, што лёд кранууся і мы вяртаемся на міжнародныя спаборніцтвы. Адабрацца на чэмпіянат свету — наогул велізарнае шчасце. Што б хто ні казаў, але выступленне на міжнародных спаборніцтвах — зусім іншы ўзровень. Чым больш удзельнікаў, тым вышэйшая канкурэнцыя. Многіх спартсменак я ведаю не першы год і была вельмі рада ўсіх бачыць, паспаборнічаць з імі. І самі саперніцы былі рады нас бачыць. Я была гатова да таго, што нас могуць неяк укалоць, настройвалася, што давядзецца абстрагавацца і рабіць сваю працу. Але не, нічога такога не было. Пасля фінішу 50 метраў брасам працягнула руку пераможцы-італьянцы, каб павіншаваць. А яна сама мяне абняла. Так, былі абмежаванні, нас не выклікалі на ўзнагароджанне, я не стаяла на п'едэстале. Вядома, гэта непрыемна, але я была гатова да такога сцэнарыя. Самае галоўнае, што я зноў адчула дух, атмасферу міжнародных стартаў, адчула спаборніцкі кураж. Увесь час, што мы былі адхіленыя, я працавала, нарошчвала вынік, таму што спартсмен не можа інакш. Але трэніравацца, не разумеючы, навошта, складана. Таму я была вельмі рада «бронзе» этапу Кубка свету і яшчэ больш рада таму, што мы зноў выступаем на міжнародных стартах.

— Няводны старт не праходзіць без паведамленняў «Аліна Змушко ўстанавіла нацыянальны рэкорд». Ты калі-небудзь лічыла, колькі іх у цябе?

— Адноўчы спрабавала, але хутка закінула, таму ведаю толькі прыкладную колькасць, дакладную нават ведаць не хачу. Каму патрэбны гэтыя лічбы? У мяне стаіць рэкорд — добра, я ўстанаўліваю новы — яшчэ лепш, гэта значыць, я пераўзыходжу свой вынік. Вось гэта галоўнае, а не статыстыка. Рэкорд — выдатна, але мы ж глядзім на перспектыву. Таму я аналізую, куды мяне прывядзе гэты вынік, наколькі я канкурэнтаздольная з ім. Са сваім вынікам на 200 метрах брасам я была б другая ці трэцяя на нядаўнім чэмпіянаце Еўропы. Вось што важна — вынік, якога я магу дасягнуць, а рэкорд ці не — другарадна.

— Лічыцца, што плыўцом можа стаць любы, але брасістам трэба нарадзіцца. Чаму?

— Першыя гады ў басейне я плавала на спіне. Аднойчы праплыла на спаборніцтвах комплексам, трэнер толькі і сказаў: «ды яна ж брасістка, навошта яе «спінай» мучаць». Пры гэтым брас я спецыяльна не трэніравала. Мне здаецца, я з нараджэння ўмею плаваць брасам. Мая мама калісьці плавала брасам і, хутчэй за ўсё, гены далі аб сабе ведаць. У мяне рухомыя гіперпластычныя суставы, у мяне рухомыя ступні, вада мяне вельмі добра трымае — усё гэта відавочна ад прыроды. Вядома, гэта не значыць, што я проста бяру і плыву. Сваю генетыку, прыродныя якасці я ўдасканаліла трэніроўкамі, адсюль і вынік. Якім бы ты ні быў адораным, на трэніроўках трэба ўкалваць. Мне ніколі проста так нічога не давалася. Вынік прыходзіць толькі да тых, хто працуе. Бывае, нешта не атрымліваецца, я тады плачу, псіхую, а потым супакойваюся, абяцаю сабе ўсё выправіць. І іду працаваць. Як спартыўны псіхолаг па адукацыі я сапраўды ведаю, што эмоцыі трэба выпускаць. Няма нічога дрэннага ў тым, каб паплакаць, пакрычаць, выгаварыцца аб тым, што баліць.

— Чым цябе зацікавіла спартыўная псіхалогія?

— Мне трэба было папрацаваць над сваім псіхалагічным станам. І я вырашыла гэта зрабіць такім чынам: разабрацца са свайімі праблемамі і атрымаць адукацыю. На нашай спецыяльнасці няма завочнай формы навучання, таму я вучылася на дзённай і паралельна працавала ў НДІ. Усе тэсты, усе методыкі я паспрабавала на сабе. З-за сваёй эмацыянальнасці я часта ўпадаю ў крайнасці: то я максімальна ў сабе, то фантаную эмоцыямі. Трэба было шукаць баланс. І, дзякуючы навучанню, я яго знайшла. Аказалася, вельмі займальна капацца ў сабе і вывучаць свой унутраны свет. Ды і ў спорце псіхалагічная падрыхтоўка важная не менш за фізічную. Як мне казаў адзін трэнер: «У фінале ўсе восем спартсменаў гатовыя заваяваць за медаль, кожны прэтэндуе на п'едэстал. Але сярод роўных фізічна перамагае той, хто лепш гатовы псіхалагічна».

— Загадчык кафедры спартыўнай псіхалогіі Уладзімір Генадзевіч Сівіцкі ў адным інтэрв'ю сказаў, што найлепшы псіхолаг для спартсмена — яго трэнер. Ты з ім пагодзішся?

— З Уладзімірам Генадзевічам нельга не пагадзіцца, гэта быў выдатны выкладчык, які шмат мне даў. Я пагаджуся, што трэнер іграе вялікую ролю не толькі ў фізічнай, але і псіхалагічнай падрыхтоўцы спартсмена. Трэнер для спартсмена — гэта мама, тата, брат, сябар, урач, псіхолаг у адной асобе. Мой трэнер мяне выдатна разумее, счытвае мой стан і, выходзячы з гэтага, выбудоўвае трэніроўку. Калі ў мяне нешта не атрымліваецца, мы абавязкова з трэнерам гэта абмяркоўваем, каб выправіць памылкі і больш іх не дапускаць. Для спартсмена вельмі важна, каб трэнер яго разумеў і працаваў з ім індывідуальна. Калі ў трэнера 10 чалавек у групе, ён фізічна не можа аддаць аднаму спартсмену столькі ўвагі, як пры індывідуальнай рабоце. Таму часам у плане псіхалагічнай падрыхтоўкі трэнеру патрэбна дапамога спецыялістаў.

— У спартсменаў часта пытаюцца аб тым, як яны рыхтуюцца да старту, і вельмі рэдка аб тым, што яны адчуваюць пасля фінішу. Што ты адчуваеш пасля заплыву?

— Часцей за ўсё — стомленасць. Калі мы рыхтуемся да спаборніцтваў, усе сілы і эмоцыі ідуць на гэтую працу. На самі спаборніцтвы іх застаецца мінімум. І калі на спаборніцтвах і гэты мінімум выплюхваецца, надыходзіць спусташэнне. І гэта нармальна, гэта азначае, што ты выклаўся цалкам. Бывае, пасля старту такая стомленасць на плечы навальваецца, што нават не застаецца сіл радавацца медалю. У 2021 годзе на адкрытым чэмпіянаце Расіі я заваявала ліцэнзію на Алімпійскія гульні. Спаборніцтвы шэсць дзён запар, і ў апошні дзень на дыстанцыі 200 метраў я адбіраюся на Алімпіяду. Фінішавала, гляджу на вынік, а ў галаве толькі адна думка: «Я нарэшце гэта зрабіла». І стомленасць.

— І тут зноў вяртаемся да таго, наколькі важная псіхалагічная падрыхтоўка — пераадолеўшы такую стомленасць, зноў вярнуцца да фізічнай працы, мусіць, могуць толькі спартсмены...

— Мы праводзім у вадзе па чатыры гадзіны ў дзень. Я назіраю за аматарамі, якія плаваюць 40 хвілін, а потым хочуць спаць, есці, паляжаць. Вада забірае вельмі шмат сіл. А мы яшчэ, акрамя басейна, працуем у трэнажорнай зале. Я звычайна дзве гадзіны плаваю і потым яшчэ паўтары гадзіны ў трэнажорнай зале працую. Некалькі гадзін адпачыла, і ўвечары зноў на трэніроўку. Гучыць, вядома, страшнавата, але мы прывыкаем да такога рытму. Калі правільна спланаваць нагрузку, то не ўсё так жудасна, але бываюць і форс-мажоры. Напрыклад, на падрыхтоўку да этапу Кубка свету ў мяне было прыкладна паўтара месяца. У сцісłыя тэрміны трэба было хутка набраць форму, падрыхтоўка ішла ў рытме вальса. Мы з трэнерам разумелі, што часу мала, таму і зрабілі акцэнт на паўсотні і на стометроўцы, на 200 метраў я не паспела б падрыхтавацца. Я толькі выйшла з водпуску, а пасля адпачынку заўсёды цяжка ўваходзіць у працоўны рытм. Аднак, калі праз два тыдні старт, часу на разварушванне няма. Усё ў нашай галаве, таму я проста настроілася на працу і пачала працаваць.

— Ці былі ў тваёй кар'еры моманты, калі хацелася пакінуць прафесійны спорт?

— Вядома. У 2017 годзе быў вельмі цяжкі перыяд, калі вынік спыніўся, і трэба было кардынальна мяняць падрыхтоўку, каб ісці далей. У такія моманты арганізм кажа: «Я ўжо зрабіў максімум, больш не магу». Гэта своеасаблівая ахоўная рэакцыя. У мяне яна выявілася ў настроі. Я не магла глядзець на ваду, на басейн. У адзін дзень я проста прыйшла на трэніроўку і сказала: «Я не хачу плаваць». На шчасце, у мяне цудоўны трэнер, і замест таго, каб прымушаць мяне, Ігар Аляксеевіч проста сказаў: «Ідзі, займайся сваімі справамі. Жаданне вернецца — прыходзь». На наступны дзень я прыйшла ў спартыўны комплекс, але да басейна не дайшла. Праз два дні прыйшла ў басейн, проста паплавала для сябе, без задання і вярнулася на вячэрнюю трэніроўку. Мне трэба было адпачыць ад плавання, каб упэўніцца, што я не змагу без яго. Я зразумела, што сёння перада мной адкрыта маса заняткаў, але мне нічога не трэба, акрамя плавання.

— Ты задаволеная цікавасцю гледачоў да плавання?

— Вядома, хочацца, каб, як на футболе, усе трыбуны былі занятыя. Мне падаецца, людзі сталі больш цікавіцца плаваннем. З-за каранавіруса мы выступалі без гледачоў. А на этапе Кубка свету зноў убачылі запоўненыя трыбуны, пачулі іх падтрымку! Гэта ўзрушае. Адразу столькі сіл і эмоцый прыбаўляецца. Усё роўна, за каго хварэюць трыбуны. Важная гэтая атмасфера.

— Часта можна пачуць фразу «ў яе плечы як у плыўчыхі». І не заўсёды гэта камплімент. Як ты ставішся да такіх выказванняў?

— У плыўчых цудоўная постаць. Я ў гэтым упэўнена, а як лічаць іншыя, мне не цікава. У мяне прыгожыя ногі, прыгожыя плечы. Так, яны крыху шырэйшыя, чым у іншых дзяўчат, але гэта не праблема. Мае плечы не перашкодзілі мне выбраць ідэальную вясельную сукенку, не перашкаджаюць выбіраць прыгожую вопратку. Таму пра такія стэрэатыпы я нават не думаю.

— Ты выйшла замуж, а некалькі гадоў таму ў інтэрв'ю казала, што спачатку Алімпіяда, а потым замужжа.

— Тады я думала, што замужжа перашкодзіць маёй кар'еры. Але, мусіць, тады я яшчэ не сустрэла свайго чалавека. Адно іншаму зусім не замінае. Наадварот, муж падтрымлівае і дапамагае. У алімпійскі год наўрад ці сталі б гуляць вяселле, усе намаганні былі б накіраваны на Алімпійскія гульні. Але мы пажаніліся ў 2023 годзе, усё правільна спланаваўшы. Распісаліся ў ЗАГСе і... я паехала на трэніроўку, з макіяжам, у прыгожай сукенцы паехала ў басейн. Трэнер скарыстаўся маёй эйфарыяй, і мы прадукцыйна папрацавалі. А вяселле згулялі падчас водпуску. Усё арганізавалі так, каб свята не перашкаджала трэніроўкам і працы, і я магла лёгка пераключыцца.

— У тым, што плаванне карыснае для здароўя, сёння ўжо ніхто не сумняваецца. Што ты як прафесіянал можаш сказаць людзям, якія ўвесь час адкладаюць паход у басейн?

